ЧЫМ ЖЫВЕ РАЁН ЭНЕРГЕТЫКАЎ 3–5

ЯК ПАДКАРМІЦЬ РАСАДУ З «ХІМІЯЙ» І БЕЗ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

11 САКАВІКА 2020 г. СЕРАДА

№ 48 (29162)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У вас бачу новую, пазітыўную, таленавітую і па-добраму амбіцыйную Беларусь»

Напярэдадні Дня Канстытуцыі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў пашпарты юным беларусам

Пашпарт — абавязковы дакумент для кожнага грамадзяніна Беларусі, які дасягнуў 14 гадоў. Дэ-юрэ ён сведчыць асобу ўладальніка, дае права на ўезд і выезд, пацвярджае грамадзянства, яднае асобу і краіну. Дэ-факта гэтая невялікая сіняя кніжка ў 33 старонкі змяшчае амаль усю гісторыю жыцця чалавека, таму атрыманне першага пашпарта — асаблівая падзея. А калі галоўны ў жыцці дакумент дастаецца з рук Прэзідэнта, значнасць мерапрыемства павялічваецца яшчэ больш.

Фота БелТА.

Прэзідэнт уручыў пашпарт вучаніцы СШ № 3 г. Астраўца Вікторыі ШЛЯХТУН.

У цырымоніі ўручэння пашпартоў у Палацы Незалежнасці ўзялі ўдзел 25 падлеткаў з усёй Беларусі. У свае 14 гадоў кожны з іх дасягнуў поспехаў не толькі ў вучобе, але і ў пэўнай сферы дзейнасці. Яны — гонар сваіх бацькоў, настаўнікаў, краіны і ўвасабленне новай таленавітай і амбіцыйнай Беларусі.

У сваім выступленні Прэзідэнт звярнуў увагу, што ва ўсе часы атрыманне пашпарта маладымі людзьмі ўспрымалася як першы крок у дарослае жыццё.

«Ведаю, што вы ўжо дабіліся пэўных поспехаў у вучобе, спорце і грамадскіх справах. Гэта выдатна, вы проста малайцы. І хачу сказаць для ўсіх, што вы прадстаўляеце ўсю нашу дзяржаву, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўпэўнены, самыя вялікія перамогі ў вас яшчэ наперадзе. ***Пры гэтым дзяржава паклапацілася, каб перад вамі былі адкрыты ўсе дарогі.*** І толькі ад асабістай мэтанакіраванасці, зацятасці і працавітасці залежыць, якіх вышынь вы і вашы аднагодкі зможаце дасягнуць у будучыні».

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што прысутныя — малайцы, бо права трапіць на сустрэчу з кіраўніком дзяржавы ў Палац Незалежнасці трэба было заслужыць. «Яшчэ раз кажу: выпадковых людзей тут няма. ***Тут людзі, якія ўмеюць працаваць і паказваць прыклад іншым, весці за сабой іншых»,*** — канстатаваў беларускі лідар.

Ён дадаў, што папярэднія пакаленні шмат зрабілі, каб мы маглі ганарыцца сваёй краінай, а цяпер чарга юнакоў развіваць, услаўляць і абараняць Беларусь.

«Магчыма, вы яшчэ не задумваецеся аб такіх важных і складаных паняццях, як самаідэнтычнасць нацыі ці незалежнасць дзяржавы. Але, толькі з'явіўшыся на свет, вы ўжо сталі часткай беларускага народа, стваральнікамі яго сучаснасці і, канешне ж, будучыні, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — ***Бо народ — мы ўсе, хто жыве, хто жыў да нас і будзе жыць пасля нас на гэтай зямлі. Таму мы адзіныя, і ад кожнага залежыць, якой краіна будзе заўтра»***.

На думку кіраўніка дзяржавы, усвядоміўшы гэта, юныя беларусы зусім па-іншаму прачытаюць першыя словы нашай Канстытуцыі: «Мы, народ Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў падлеткам, у чым сутнасць галоўнага прызначэння грамадзяніна — служыць Айчыне.

СТАР. 2

Дзяржаўны інтарэс

І будзе ў горадзе дыхацца, як у лесе пасля дажджу

Такое «фэнтэзі» стане рэальнасцю, калі мы ўсе перасядзем на электрамабілі і калі АЗС заменім на ЭЗС

На нядаўняй нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў Прэзідэнт нашай дзяржавы заўважыў: «няўпэўненасць з цаной на нафту і, адпаведна, на паліва даказвае, што электратранспарт валодае каласальным патэнцыялам. І справа тут нават не ў нафце. Справа ў тым, што гэта — перспектыва. І ўсе краіны такія, як мы, — экспартаарыентаваныя, якія не маюць пад зямлёй вялізных запасаў, — даўно пераарыентаваліся на электратранспарт».

Даручэнне стварыць уласны электрамабіль атрымала Нацыянальная акадэмія навук, якая летась паведамляла, што ён практычна гатовы. Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што гэта не проста даніна модзе ці імкненне не адстаць ад перадавых краін. «Гэта надзённая неабходнасць ужо сёння», — сказаў ён.

На нарадзе гаварылася ў тым ліку і пра тое, што можа заахвоціць людзей перасесці на экалагічныя машыны. Адзін з самых важных стымулаў — наяўнасць і паўсюдная даступнасць станцый, на якой электрарухавік можна падсілкаваць. Як з вырашэннем гэтай задачы спраўляюцца сёння і якія перспектывы на найбліжэйшую будучыню, у гэтым мы з дапамогай спецыялістаў і паспрабуем разабрацца.

Ужо можам заправіць 9 тысяч машын

Першая зарадная станцыя з'явілася ў нашай краіне ў 2014 годзе. Праз тры гады іх было ўжо 17, а за апошні час сетка электразаправак «Беларуснафты» павялічылася да 251 ЭЗС па ўсёй краіне. Кампанія забяспечыла зараднымі станцыямі галоўныя магістралі краіны, а таксама паркоўкі побач з буйнымі камерцыйнымі, спартыўнымі і культурнымі аб'ектамі. Такая колькасць заправак можа абслугоўваць да 9000 электрамабіляў. Максімальная адлегласць паміж станцыямі на трасе — 90 кіламетраў, а ў горадзе — 3-5 кіламетраў. Цяпер электрамашыны запраўляюць два тыпы станцый — MODE-3 і MODE-4. Трэцяя мадыфікацыя мае працягласць поўнай зарадкі 6—8 гадзін, а чацвёртая — 15—30 хвілін.

Акупнасць праекта — 5-6 гадоў

На сёння развіццё сеткі электразарадных станцый прадугледжвае іх павелічэнне. Да 2021 года іх будзе ўстаноўлена больш за 600. Яшчэ праз год — ужо 640. У планах — да 2022 года пашырыць сетку так, каб без праблем зараджаць да 35 тысяч машын.

СТАР. 2

Марына, Паліна, Мілана, Аліна...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск. Шматдзетная матуля Марына ВАРАКОМСКАЯ са сваімі дачкамі Палінай, Міланай і Алінай на прагулцы па вясновай вуліцы.

Жывi i квітней, Беларусь!

ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПШ

Распрацоўкі беларускіх вучоных дапамогуць у своечасовай дыягностыцы

Беларускія вучоныя распрацоўваюць некалькі кірункаў па выяўленні анкалагічных захворванняў, у прыватнасці, па вызначэнні цыркуляцыі ракавых клетак у крыві. Гэтыя метады могуць дапамагчы ў дыягностыцы, у тым ліку і рэцыдываў захворвання. Таксама ў працэсе стварэння біячып і прылада для счытвання інфармацыі, якія дазволяць выяўляць ракавыя клеткі пры злаякасных захворваннях крыві. Пакуль новыя метады дыягностыкі і лячэння вучоныя толькі распрацоўваюць, у Беларусі з 2016 года дзейнічаюць скрынінгавыя праграмы па выяўленні раку чатырох лакалізацый на ранніх стадыях. Менавіта такія праекты апрабаваны і працуюць у краінах Еўропы, ЗША і Канадзе. У тым ліку і гэта дазваляе нашай медыцыне мець сярэднееўрапейскі паказчык па выяўленні і лячэнні раку. Якія навінкі па дыягностыцы гэтай хваробы з'явяцца ў найбліжэйшы час дзякуючы распрацоўкам айчынных вучоных і якая карысць ад скрынінгавых праграм, расказалі спецыялісты.

Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі працуе па трох кірунках скрынінгу анказахворванняў. Два з іх накіраваны на выяўленне саміх злаякасна змененых клетак, яшчэ адзін — на атрыманне генетычнага матэрыялу з пухлінных клетак.

— Адзін з кірункаў — выяўленне цыркуляцыі ракавых клетак. У працэсе росту частка клетак адрываецца ад першаснай пухліны, цыркулюе з токам крыві, асядае ва ўнутраных органах і дае рост метастазаў, а разам з ім і новыя ачагі хваробы, — тлумачыць **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй ГАНЧАРОЎ.** — Адпаведна, выяўленне ў крыві такіх цыркулюючых ракавых клетак можа быць адным з крытэрыяў дыягностыкі, у тым ліку і рэцыдываў захворвання.

Ён адзначыў, што ўжо ёсць інструкцыя, у якой апісаны метад, і ў хуткім часе яго можна будзе прымяняць на практыцы.

СТАР. 7

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Італьянскі ўрад закрыў на каранцін усю краіну

Пра новыя надзвычайныя меры ў сувязі з распаўсюджаннем каранавіруса заявіў прэм'ер-міністр Італіі Джузепе Контэ. Цяпер усім грамадзянам рэкамендавана не пакідаць свае дамы «без крайняй неабходнасці», забаронена правядзенне масавых мерапрыемстваў, закрыты навучальныя ўстановы. «Самым правільным рашэннем сёння было б застацца дома. Наша будучыня, будучыня Італіі — у нашых руках. Мы павінны ўзяць на сябе адказнасць за яе, сёння гэта важна як ніколі. Мы прынялі рашэнне пашырыць меры, якія дагэтуль датычыліся толькі Ламбардыі і некаторых іншых правінцый, на ўсю тэрыторыю краіны», — адзначыў прэм'ер-міністр Італіі Джузепе Контэ. Закрытыя музеі, бібліятэкі, басейны і бары. Новыя абмежаванні ўступілі ў сілу 10 сакавіка і будуць дзейнічаць як мінімум да 3 красавіка. Як вядома, па колькасці хворых Італія апынулася на другім месцы ў свеце пасля Кітая, а па ўзроўні смяротнасці — амаль пяць працэнтаў насельніцтва — на першым.

Тым часам авіякампанія «Белавія» прыпыняе палёты ў Мілан.

ЗША пачалі вывад войскаў з Афганістана

Злучаныя Штаты пачалі працэс выводу сваіх войскаў з афганскай тэрыторыі ў межах дасягнутага раней пагаднення з радыкальным рухам «Талібан». Пра гэта гаворыцца ў заяве афіцыйнага прадстаўніка амэрыканскіх сіл у Афганістане (USFOR-A) палкоўніка Соні Легета. Як заявіў афіцэр, на працягу 135 дзён плануецца скараціць колькасць амерыканскага кантынгенту да 8,6 тысячы чалавек. Пры гэтым будзе ўлічвацца канкрэтная абстаноўка ў краіне. Таксама Соні Легет дадаў, што амерыканскае камандаванне працягвае аказваць падтрымку сілам абароны і бяспекі Афганістана і праводзіць антытэрарыстычныя аперацыі, піша ТАСС. У канцы лютага ў Досе было падпісана пагадненне аб перамір'і ў Афганістане. Згодна з умовамі дагавора, ЗША і краіны НАТА абавязаны на працягу 14 месяцаў цалкам вывесці свае войскі з краіны. Днямі Махамад Ашраф Гані афіцыйна ўступіў на пасаду прэзідэнта Афганістана. У прысутнасці суддзяў вярхоўнага суда краіны ён прынёс прысягу кіраўніка дзяржавы.

Турцыя і ЕС рыхтуюць здзелку па мігрантах

Еўрасаюз і Турцыя абнаўляюць пагадненне аб абмежаванні нелегальнай міграцыі на фоне крызісу на грэчаскай граніцы. Такое рашэнне было прынята падчас візіту турэцкага лідара Рэджэпа Таіпа Эрдагана ў Брусель. У найбліжэйшыя дні рабочыя групы пад кіраўніцтвам вярхоўнага прадстаўніка ЕС Жазепа Барэля і кіраўніка МЗС Турцыі Меўлюта Чавушоглу павінны ўзгадніць новыя ўмовы дагавора. У Бруселі кажуць, што разлічваюць такім чынам знайсці выхад з крызісу. Турэцкая дэлегацыя назвала перагаворы ў Бруселі «прадукцыйнымі», аднак Рэджэпа Таіп Эрдаган ад заяў па іх выніках устрымаўся. Сітуацыя на грэчаскай граніцы ўскладнілася ў лютым, калі Анкара абвінаваціла Еўрасаюз у невыкананні фінансавай часткі абавязацельстваў у рамках міграцыйнага пагаднення 2016 года і заявіла, што больш не будзе абмяжоўваць паток бежанцаў у ЕС.

КАРАТКА

- **Інфляцыя ў Беларусі ў лютым склала 1 %.**
- Школьнікаў запрашаюць паўдзельнічаць у конкурсе эсэ «Мы ў адказе за Перамогу».
- **Фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне «Снежны снайпер» перанесены на красавік.**
- У Чэхіі размалявалі Карлаў мост.



- **У буйных гарадах Мінскай вобласці плануюць замяніць аўтобусы на электробусы.**

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

З АГНЁМ НАВЫПЕРАДКІ

Чаму выпальванне травы зноў збірае ахвяры?

Сакавік і красавік — перыяд, калі людзі актыўна наводзяць парадак на зямлі. І адначасова ў гэтыя веснавыя месяцы «лічыльнік» пажараў у экасістэмах пачынае працаваць напоўніцу. Прычым год ад году дата яго «старту» становіцца ўсё ранейшая. Мяркуйце самі: калі ў 2018 годзе сакавік выдаўся сапраўдным зімовым месяцам, то і першыя пажары былі зафіксаваны 9 красавіка. Летась снег сышоў ужо значна раней, таму ўзгаранні ў экасістэмах пачаліся 24 лютага. А сёлета з-за цёплай і бясснежнай зімы і ўвогуле — 16 лютага. Колькасць іх набліжаецца да паўсотні. Чаго ж чакаць далей?

Пра гэта «Звязда» распытала **памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталя НАВІЦКАГА.**

— На мінулым тыдні з гэтай нагоды адбылося пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў. Па папярэдніх звестках, пададзеных падчас яго спецыялістамі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, ад таго, што кліматычная зіма сёлета да нас так і не прыйшла і трывалае снегавое покрыва не ўтварылася, імавернасць паводкі гэтай вясной вельмі нязначная. Нават калі вадаёмы дзе і разальюцца, то такія з'явы будуць мінімальныя і зусім лакальныя. Але ў гэтага медаля ёсць другі бок: паколькі снегу не было, то ў пачатак вясны мы ўступаем без вялікіх запасаў вільгаці ў нашых экасістэмах. І на гэтым фоне магчыма ўскладненне пажарнай абстаноўкі. Разам з тым падставы для аптымізму ёсць. Метэаролагі папярэдне разлічылі, што другая палова сакавіка будзе прахалодная і вільготная. Калі гэты доўгатэрміновы прагноз спраўдзіцца, то ў лясах захаваецца цяперашні мінімальны, першы клас пажарнай небяспекі. Зараз сітуацыю ратуюць дажджы, якія даволі часта ідуць у нашай краіне.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

«У вас бачу новую, пазітыўную, таленавітую і па-добраму амбіцыйную Беларусь»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«***Патрыятызм — не проста размовы пра тое, як мы любім Радзіму. Але і казаць пра гэта трэба. Гэта штодзённая праца на яе карысць. Захаванне гістарычных і культурных традыцый, абарона інтарэсаў дзяржавы і жыцця людзей.*** Усё гэта — каштоўнасці, якія нашым продкам даводзілася адстойваць са зброяй у руках», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён заклікаў заўсёды памятаць, што 75 гадоў таму нашы дзяды і прадзеды ценой неймаверных ахвяр і небывалага гераізму адваявалі для беларусаў права на існаванне, разгромілі фашызм, перад якім уся Еўропа стаяла на каленях.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што гэту спадчыну новае пакаленне будзе берагчы.

«У вас бачу новую, пазітыўную, таленавітую і па-добраму амбіцыйную Беларусь. Гэта мяне радуе, як і ўсіх вашых бацькоў. Ідзіце наперад да абранай мэты, ніколі не здавайцеся і, самае галоўнае, ніколі нічога і нікога не бойцеся. Верце ў сябе, верце, што калі вы ідзяце наперад, вам абавязкова дапамогуць, і абавязкова, як правіла, на вашай роднай зямлі, у вашай Беларусі», — завяршыў сваё выступленне Прэзідэнт.

Пасля цырымоніі ўручэння да Аляксандра Лукашэнкі звярнуўся вучань, ураджэнец Быхаўшчыны Дзмітрый Іваноў. Ён расказаў пра сваю мару стаць журналістам і дзейнасць па выданні гімназічнай газеты. Хлопец папрасіў зрабіць сумеснае фота з Прэзідэнтам і паабяцаў перадаць яму свежы нумар выдання, дзе яно будзе апублікавана.

«Будзьце журналістамі, артыстамі, інжынерамі, аграномамі — усё нам трэба будзе ў гэтым жыцці ў нашай краіне. Поспеху вам, і галоўнае — будзьце шчаслівыя. Не спяшайцеся выбіраць прафесію, прыглядайцеся, у вас яшчэ ёсць час. А то будзе як у мяне: паспяшаешся, а потым давядзецца дадаткова вучыцца», — параіў Аляксандр Лукашэнка.

Для юных беларусаў таксама правялі экскурсію па Палацы Незалежнасці, кожнаму з іх уручылі кнігу і салодкія падарункі ад кіраўніка краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

Паслугі — у рэгіёны

КОЛЫ НА ЧАС

Новая паслуга — аўтамабіль у пахвілінную арэнду, ці каршэрынг, — усё больш набірае папулярнасць. Лічыцца, што калі людзі замяняюць куплю аўтамабіляў арэндай, сумесна карыстаюцца машынамі, то гэта прыводзіць да зніжэння агульнай колькасці транспарту на дарогах. Як вынік, развіццё каршэрынгу можа дапамагчы ў вырашэнні экалагічных, транспартных і сацыяльных праблем у буйных гарадах. Гомель — першы абласны цэнтр, дзе пачала дзейнічаць міжнародная сістэма каршэрынгу.

abw.by

Скарыстацца паслугамі сэрвісу могуць грамадзяне, не маладзейшыя за 19 гадоў, са стажам кіроўцы не меншым за 1 год. Для арэнды аўто патрэбныя толькі смартфон і банкаўская картка. У мабільнай праграме падчас рэгістрацыі профілю сістэма «спытае фотадоказы»: здымкі пасведчання кіроўцы з двух бакоў і старонак з асноўнай інфармацыяй у пашпарце, а таксама здымак уласна чалавека з яго дакументамі. За профілем будзе замацавана і банкаўская картка для аплаты. З гэтага моманту можна карыстацца паслугамі сэрвісу.

Пазначаны канкрэтны спіс месцаў, у якіх аўтамабіль бясплатна застаецца на паркоўцы. Арандаваць машыну магчыма як для кароткіх паездак, так і для доўгіх падарожжаў. Прадугледжаны спіс правілаў карыстання аўтамабілем, за парушэнне якіх арандатар будзе несці адказнасць.

Паводле ўнутранай статыстыкі сэрвісу, адным аўтамабілем штодня могуць карыстацца ад 6 да 12 кіроўцаў. Агульная база карыстальнікаў дазваляе перамяшчацца па ўсёй тэрыторыі Беларусі з адной умовай: машыну неабходна пакінуць у зоне ахопу — у Мінску ці Гомелі.

Між тым сэрвіс у Гомелі забяспечвае кампанія, якая ў Беларусі дае аўтамабілі ў арэнду з 2018 года. За абласным цэнтрам іх пакуль замацавана 20.

— Мы разумеем, што такая колькасць аўто — гэта мала для вялікага горада, таму на старце не зможам ахапіць усю тэрыторыю Гомеля. Да канца 2020 года збіраемся давесці лічбу даступных аўтамабіляў да 100 і, адпаведна, па меры павелічэння парку падключаць новыя зоны, — паведаміў **дырэктар «Anytime Беларусь» Станіслаў БЕЦІН.** Па яго словах, да паслугі каршэрынгу падключыліся ўжо каля 500 гамяльчан.

У Гомелі прадумана ўся лагістычная сістэма, набраны штат кіроўцаў і аператараў службы падтрымкі, заключаны дамовы па тэхнічным абслугоўванні аўтамабіляў. Дзейнічае тая ж сістэма тарыфаў, што і ў Мінску: базавы кошт хвіліны — 0,3 рубля. Перспектыва каршэрынгу ў Гомелі ацэньваецца ў 600—800 машын. Менавіта такая колькасць дазволіць цалкам ахапіць абласны цэнтр, дасць магчымасць ахвотным скарыстацца паслугай у любы момант і дачакацца вольнага аўтамабіля за пяць хвілін.

Сэрвіс будзе дзейнічаць ва ўзаемадзеянні з гарадскімі ўладамі. Мэта — максімальна інтэграваць паслугу ў сістэму транспартных зносін Гомеля і рэгіёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

З АГНЁМ НАВЫПЕРАДКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Больш раннія даты пачатку ўзгаранняў у прыродзе прыводзяць да таго, што колькасць такіх выпадкаў істотна расце год ад году. Мяркуйце самі: калі ў 2017 годзе іх было 1598, то ўжо летась — 2688. Сёлета пакуль гэты лік набліжаецца да паўсотні. Сваю лепту ў гэта ўносіць тое, што ў папярэднія два гады красавік быў шчодры на цеплыню, а вось на ападкі — скупы. Самае страшнае ж — так званыя «зацяжныя» пажары, якія трэба тушыць не адзін дзень. Напрыклад, на тое, каб утаймаваць стыхію летась на Альманскіх балотах, спатрэбілася пяць дзён. Нагадаем, што тады агонь ахапіў плошчу ў 400 гектараў — і па законе подласці ў цяжкадаступных месцах.

— Амаль усе такія пажары выкліканы чалавечай неахайнасцю, — працягвае суразмоўца. — Так, бываюць выпадкі, калі лес падпальвае маланка без дажджу. Або калі донца ад бутэлькі служыць своеасаблівай збіраючай лінзай для прамых сонечных прамянёў. Але ўсё гэта адзінкава. Часцей за ўсё вінаватыя не затушаныя да канца вогнішчы пасля адпачынку на прыродзе або выпальванне на корані сухой расліннасці на ўласных прысядзібных участках. У такіх пажарах за апошнія пяць гадоў загінулі 23 чалавекі, яшчэ 37 атрымалі апёкі. Сярэдні партрэт ахвяры такога ўзгарання — чалавек у паважным узросце, які ўжо фізічна не можа хутка перасоўвацца. Нават пры невялікім ветрыку хуткасць агню, які распаўсюджваецца па зямлі, можна параўнаць з хуткасцю перамяшчэння чалавека, які бяжыць. Акрамя таго, у стрэсавай сітуацыі могуць імкліва абвастрыцца захворванні рознага роду, а падчас гарэння выдзяляецца вялікая колькасць вуглякіслага і чаднага газу, які і атручвае таго, хто знаходзіцца побач.

Так, 29 сакавіка мінулага года ў вёсцы Паршына Горацкага раёна жонка ўбачыла мужа, які ляжаў непадалёк ад дома ў палаючай траве. Яна тут жа выклікала ратавальнікаў, якія і патушылі полымя на плошчы 50 квадратных метраў. На жаль, чалавеку ўжо нічым нельга было дапамагчы.

І нават калі непасрэдны вінаўнік пажару не пацярпеў, гэта не заўжды можна сказаць пра пабудовы. Летась 3 красавіка ратавальнікам паступіла паведамленне пра тое, што ў вёсцы Бабовікі Полацкага раёна гараць жылы дом і лазня на адным з участкаў. Адстаяць іх у агні не атрымалася.

— Землекарыстальнікам трэба было ў ідэале навесці парадак яшчэ ўвосень, — кажа Віталь Навіцкі. — Але калі апалае лісце і леташняя трава на ўчастку ўсё ж засталіся, то пазбаўляцца ад іх трэба больш цывілізаваным спосабам. Напрыклад, пусціць на перагной або спаліць у металічнай ёмістасці. Вогнішчы можна разводзіць толькі ў спецыяльна прызначаных для гэтага месцах і абавязкова мець пры сабе вогнетушыцель, вядро з пяском або вадой. І не дапускайце, каб побач з агнём гулялі малыя дзеці.

Часам тое, што на чыімсьці прысядзібным участку гарыць трава, заўважаюць даволі позна. Напрыклад, у будныя дні да пачатку сезону адпачынкаў у тых жа садовых таварыствах мала хто знаходзіцца пастаянна. Адпаведна, і шанцаў на тое, што сусед убачыць агонь і выкліча ратавальнікаў, становіцца прапарцыйна меней. Сучасныя платы з металапрофілю таксама перакрываюць агляд з вуліцы, і даведацца пра тое, што гарыць трава, можна толькі па паху і дыме, калі ўжо можа быць позна.

Ніякай карысці веснавыя палы травы не прыносяць. Затое шкоды нясуць вельмі шмат. Павышаецца кіслотнасць глебы, а пладароднасць змяншаецца. Як вынік, расліннасць пачынае імкліва збядняцца. На гібель асуджаны ўсе дробныя жывёлы і насякомыя, для якіх трава або паверхня зямлі — родны дом.

— Па нашых разліках самыя складаныя ў плане пажараў у прыродных экасістэмах тэрыторыі — Брэсцкая, Гомельская вобласці і поўдзень Мінскай, — сцвярджае Віталь Навіцкі. — І ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях ёсць свае планы рэагавання на магчымую пагрозу. Мы сфарміравалі 11 зводных атрадаў. Яны ўкамплектаваны тэхнікай павышанай праходнасці і налічваюць у сваіх шэрагах больш за 600 чалавек. За 6 гадзін яны могуць дабрацца ў любы пункт вобласці, а за 12 — краіны. Дзе ёсць магчымасць, выкарыстоўваюцца спецыяльныя інжынерныя машыны. Таксама распрацаваны 32 маршруты для авіяпатрулявання. Яны ахопліваюць 80 % тэрыторыі Беларусі. Рэшта падае на гарады і іншыя густанаселеныя мясцовасці, дзе неабходнасці ў пастаянным назіранні з паветра няма.

Ці можна ж патушыць палаючую траву самастойна?

— Перш за ўсё трэба паведаміць пра ўзгаранне па нумары 101 або 112. Нават калі вы едзеце праз невядомы населены пункт, то дыспетчар стане задаваць наводзячыя пытанні і дазнаецца пра ваша месцазнаходжанне. Ну а за тыя некалькі хвілін, пакуль будуць ехаць ратавальнікі, можна паспрабаваць суцішыць узгаранне і самому. Трэба не падыходзіць у той бок, куды дзьме вецер, і збіваць полымя пры дапамозе галінак дрэў, пяску, зямлі і вады.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

НА ДАПАМОГУ ПРЫЙДЗЕ ПСІХОЛАГ

Справы, у якіх фігуруюць дзеці, пацярпелыя ад гвалту, заўжды няпростыя. Эксперту трэба здабыць як мага больш поўную інфармацыю пра тое, што адбылося, пры гэтым не ранячы яшчэ мацней тонкую дзіцячую душу. Шмат што залежыць ад умення «разгаварыць» хлопчыка або дзяўчынку.

У Мінску на праспекце Любімава ў аўторак адкрыўся практычны і вучэбны цэнтр судовай псіхіятрыі. Ва ўрачыстай цырымоніі ўзялі ўдзел старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй Швед, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс і намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандр Рахманаў. Цэнтр будзе працаваць з дзецьмі, якія або пацярпелі ад злачынстваў, або сталі іх сведкамі.

Раней на месцы цэнтра знаходзілася ўстанова адукацыі. Яна яшчэ ў 2011 годзе была зачынена на рэканструкцыю, якая неаднаразова пачыналася і неўзабаве спынялася праз недахоп грошай. І толькі дзякуючы рашэнню кіраўніка дзяржавы ў 2015 годзе былі выдзелены дадатковыя сродкі для правядзення першачарговых агульнабудаўнічых работ, а ў далейшым забяспечана неабходнае фінансаванне з рэзервовага фонду Прэзідэнта.

— Асаблівасць цэнтра ў тым, што ў гэтых сценах сабраны найлепшыя спецыялісты з усёй краіны ў галіне судовай псіхалогіі, культуралогіі, псіхіятрыі, — зазначыў **старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй ШВЕД.** — Тут жа ўкаранёны і выкарыстоўваюцца самыя лепшыя сусветныя навукова абгрунтаваныя методыкі. У сукупнасці гэта ўсё дазваляе з імавернасцю, блізкай да 100 %, высветліць усе акалічнасці, звязаныя са здзяйсненнем у дачыненні да дзіцяці гвалтоўных злачынстваў і іншых супрацьпраўных дзеянняў. У некаторых выпадках мы высвятляем у іх абставіны злачынстваў, сведкамі якіх яны сталі. Акрамя таго, яшчэ адна місія цэнтра — служыць у якасці сучаснай вучэбнай пляцоўкі для будучых судовых экспертаў гэтага профілю.

Але першае, што пабачыць малы ў цэнтры, — гэта абстаноўка. Яе пастараліся зрабіць максімальна дружалюбнай і камфортнай. Фае цэнтра сустракае тэлевізарам, які паказвае мультфільмы з прыглушаным гукам. Побач з ім — акварыум. У спецыялізаваным дзіцячым пакоі створана абстаноўка, якая дапаможа малому адчуць сябе як дома. Паўсюль раскладзены дзіцячыя мяккія цацкі, машынкі. Але пакой гэты — з сакрэтам. За спецыяльным шклом тут знаходзіцца пакой маніторынгу. Менавіта там спецыяліст будзе фіксаваць пры дапамозе камп'ютара размову псіхолага з малым.

— Трэба разумець, што дзеці перажылі вельмі складаны перыяд у жыцці, — заўважыў Андрэй Швед. — І мы абавязаны стварыць такія ўмовы, каб дзіця не перанесла другі раз стрэс, звязаны з успамінам пра здзейснены ў дачыненні да яго гвалт. Тут жа ў нас створаны неабходныя ўмовы для таго, каб малое адчувала сябе ў бяспецы. Функцыянальна цэнтр дзеліцца на дзве структуры: адна для знаходжання дзіцяці з бацькамі, другая — для яго работы са спецыялістамі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Дыялог

Праз мінулае — да будучага

З 10 сакавіка да 30 красавіка ў Беларусі праходзяць Тыдні Германіі.

Яны пачаліся з адкрыцця маштабнай выстаўкі «Шляхі нямецкага мастацтва» — экспазіцыя ахоплівае 60 пасляваенных гадоў Усходняй і Заходняй Германіі. У мінскім Палацы мастацтва прадстаўленыя жывапіс, графіка, фатаграфія, відэа, скульптура і інсталяцыі: усяго каля 400 твораў амаль 100 мастакоў.

Цікавымі абяцаюць быць і вечары нямецкага кароткаметражнага кіно. У рамках праграмы «Берлін: біяграфія горада» будуць дэманстравацца пяць фільмаў, якія адлюстроўваюць самыя знакавыя моманты ў гісторыі сталіцы Германіі: бурныя 20-я, узнікненне і станаўленне нацыянал-сацыялізму, перыяд халоднай вайны, падзенне Берлінскай сцяны і, нарэшце, жыццё сённяшняга Берліна.

Тыдні стануць своеасаблівым экскурсам у ваеннае мінулае праз прызму сённяшняга дня. Так, выстаўка «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць» будзе экспанавацца з 8 красавіка да 8 мая ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Экспанаты выстаўкі — работы мастакоў, звязаныя з тэмай вайны і памяці пра яе.

Мэта гэтага і іншых тэматычных мерапрыемстваў — аддаць даніну памяці ахвярам нацызму, а таксама паспрыяць развіццю міжнароднага дыялогу даследчыкаў і гісторыкаў Беларусі, Германіі, Аўстрыі і іншых краін. Апошняе здаецца надзвычай актуальным на фоне спроб перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЯСПЛАТНЫ НАТАРЫУС У ГОНАР КАНСТЫТУЦЫІ

Натарыусы ўсёй краіны 13 сакавіка возьмуць удзел у дабрачыннай акцыі па бясплатным кансультаванні, прымеркаванай да святкавання Дня Канстытуцыі Беларусі.

Грамадзяне, якія звернуцца ў гэты дзень у любую натарыяльную кантору ці натарыяльнае бюро, змогуць разабрацца з існуючай праблемай падчас бясплатнай гутаркі са спецыялістам.

Можна будзе, напрыклад, вырашыць пытанні, звязаныя з афармленнем спадчыны, складаннем шлюбнага дагавора, адчужэннем маёмасці, здзяйсненнем выканаўчых надпісаў, падачай электронных дакументаў для дзяржрэгістрацыі юрыдычных асоб або індывідуальных прадпрымальнікаў, забеспячэннем пісьмовых доказаў, а таксама з іншымі праблемамі, рашэнне якіх уваходзіць у кампетэнцыю натарыуса.

Спіс і час работы натарыяльных бюро і кантор краіны можна знайсці на сайце Беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by у раздзеле «Знайсці натарыуса».

Ірына СІДАРОК.

І будзе ў горадзе дыхацца, як у лесе пасля дажджу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Стартавыя зарадныя станцыі, якія мы ўстанавілі, каштавалі прыкладна 60—70 тысяч еўра, — расказаў **намеснік гендырэктара «Беларуснафты» Андрэй КОЦІК.** — Цяпер такія станцыі каштуюць 17—20 тысяч долараў. Але з-за таго, што ў многіх месцах трэба праводзіць рэканструкцыю электрасеткі, канчатковая цана адной зарадной станцыі можа вырасці ў тры разы».

Што датычыцца эканамічнага боку праекта, Андрэй Коцік растлумачыў: аб'ём інвестыцый вызначаецца не толькі коштам зарадных станцый, але і месцамі падключэння да электрасетак. Ад гэтага залежыць, ці патрэбныя дадатковыя інвестыцыі і ў якім аб'ёме. Чакаецца, што інвестыцыі толькі ў сетку суперхуткіх зарадных станцый складуць каля 150 мільёнаў еўра, крэдытныя сродкі пад гэты праект могуць выдзеліць міжнародныя банкі. «Гэта пытанне адкрытае, вядзём перагаворы з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця і Еўрапейскім інвестыцыйным банкам», — растлумачыў Андрэй Коцік. Пад названыя тэхналогіі выдзяляюцца «доўгія» пазыкі, тэрмін акупнасці такіх праектаў складае 5-6 гадоў.

З 2022 года — толькі «хуткасныя» запраўкі

Для будучых электрамабілістаў да гэтага часу будуць усталёўвацца толькі хуткія станцыі, на якіх можна папоўніць запас ходу на 35 кіламетраў усяго за 7 хвілін. Падлічана, што гэтага зараду хопіць на некалькі паездак па горадзе.

Акрамя таго, у сетцы Malanka з'явіцца і суперхуткія, «вокамгненныя» станцыі, якія зараджаюць электрамабіль за 10—12 хвілін на 345 кіламетраў прабегу. Пачаць запуск такіх ЭЗС плануецца з асноўных магістраляў і сталіцы, затым яны паступова пакрыюць усю краіну. Першыя суперхуткія ЭЗС можна будзе пратэсціраваць у канцы 2020 года, паўнавартаснае развіццё плануецца арыенціравана да 2024-га.

Зараз іх 350, а будзе 300 тысяч

Першы электрамабіль у Беларусі з'явіўся параўнальна нядаўна — у 2013 годзе адносна немалады Nissan Leaf прывезла і паставіла на ўлік адна заправачная кампанія. Гэтая ж арганізацыя тады адкрыла першую ў Беларусі зарадку для электрамабіляў. Потым развіваць сетку зарадных станцый даручылі «Беларуснафце». Дзякуючы гэтай кампаніі ў нашай краіне зарадная інфраструктура развілася раней, чым рынак заваявалі электрамабілі.

Менавіта цяпер, калі прапанова масавага сегмента электратэхнікі актыўна расце, у нас на самым высокім узроўні прымаюцца дадатковыя меры па павелічэнні колькасці электракараў. «У электрамабіляў вельмі вялікі патэнцыял, у першую чаргу з фундаментальнай прычыны. І гэтая прычына — даступнасць электраэнергіі як рэсурсу. Нават у звычайным пакоі ёсць магчымасць падзарадзіць электрамабіль», — сказаў Андрэй Коцік.

А навошта нашай краіне такая магутная інфраструктура зарадкі, калі саміх электрамашын (не электробусаў) у нас практычна адзінкі? Па інфармацыі Андрэя Коціка, у грамадзян Беларусі налічваецца каля 350 электрамашын або аўтамабіляў на гібрыднай цязе. Але эксперты чакаюць істотны рост колькасці электрамабіляў на дарогах у найбліжэйшыя гады.

Гэта звязана з тым, што іх кіроўцам будзе аказана падтрымка з боку дзяржавы. Раней пры куплі электрамабіля за межамі краіны кіроўца дадаткова выплачваў ПДВ — яшчэ 20 % кошту электракара. Чакаецца, што неўзабаве гэты падатак будзе ануляваны (пра што таксама гаварылі на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы). Больш за тое, Калегія Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕЭК) падтрымала рашэнне аб устанаўленні нулявой стаўкі мытнай пошліны. Калі яно будзе канчаткова прынята, то цана электрамабіля ў нашай краіне панізіцца на 38 %.

Для прыкладу возьмем папулярны сёння ў Еўропе электрамабіль Skoda Citigo IV. Цана новай машыны з усімі плацяжамі — 29 700 долараў. Калі прыбраць ПДВ, цана знізіцца да 24 800 долараў, а калі яшчэ і адабраць растаможку — да 21 000.

Пры пацвярджэнні запланаванай дынамікі спецыялісты разлічваюць да 2025 года атрымаць павелічэнне колькасці электрамабіляў у Беларусі да 100 тысяч, а да 2027 года іх колькасць можа вырасці да 300 тысяч штук.

«Тут відавочна, што пытанне ў эканоміцы. Але не толькі ў эканоміцы, але і ў практыцы, і ў прыкладах, якія былі ў суседніх краінах. Гэта перш за ўсё Украіна. Менавіта адмена ПДВ і ўсіх абцяжараванняў прывяла да таго, што сёння там ні многа ні мала 30 тысяч электрамабіляў. Толькі ў студзені было зарэгістравана 500 новых. Гэта значыць, меры стымулявання былі больш чым дастатковыя, і там адбыўся літаральна выбух», — падкрэсліў намеснік гендырэктара «Беларуснафты».

У машыне дробязяў не бывае

Улетку «Беларуснафта» плануе выпусціць фірменную праграму для смартфонаў, каб дапамагчы кіроўцам электракараў разлічыць запас ходу да запраўкі. У праграме можна будзе пракладваць маршрут да найбліжэйшай станцыі, рэзерваваць «калонку» і мець зносіны са службай падтрымкі ў выпадку якіх-небудзь непаладак.

Пакуль адкрытае застаецца пытанне з месцам для зарадкі каля ЭЗС — праз дэфіцыт месцаў іх часта займаюць аўто з рухавіком унутранага згарання. Намеснік гендырэктара паведаміў, што праблему спрабавалі вырашыць: МУС па даручэнні Саўміна павінна было ўвесці абмежавальныя меры, каб аўтамабілі з «гарачымі» рухавікамі не займалі месца электракараў каля станцый, але рашэнне пакуль прынята не было. Па словах прадстаўнікоў «Беларуснафты», гэта праблема не толькі нашай краіны: «Блакатараў парковак не будзе ў найбліжэйшы час. З нашага боку — мы ставім станцыі, ад якіх могуць зараджацца адразу два электрамабілі».

Для параўнання з беларускімі рэаліямі прывядзём словы Кейса Бадэна, начальніка сектара па развіцці бізнесу кампаніі Cenex:

«Я праязджаю 300 тысяч кіламетраў у год на сваім Nissan Leaf, эканомлю прыкладна 200 еўра ў месяц. Сёння ў Вялікабрытаніі 230 тысяч электрамабіляў, у краіне 31 тысяча станцый, у мінулым месяцы ўсталявалі 467 электразаправак. У красавіку для англічан з е-мабілем з'явіцца падатковыя прэферэнцыі. На мой погляд, у Беларусі ёсць перспектывы для стварэння электрамабіляў на ўжо існуючых заводах (я наведаў «БелДжы», «Белкамунмаш», БелАЗ, МТЗ). Па-мойму, у вашай краіне зрабілі правільную стаўку ў развіцці электрычнага транспарту — а менавіта, у першую чаргу стварэнне інфраструктуры. Вы не сталі чакаць, каб потым падладжвацца пад патрабаванні ўладальнікаў е-караў».

На думку англічаніна, самая цікавая тэма, якую яму трэба будзе вырашыць у супрацоўніцтве з беларускім бокам, датычыцца электрыфікацыі цяжкіх самазвалаў.

Стаўка Еўропы на электрычнасць

Абапіраючыся на прагнозы Bloomberg, Андрэй Коцік паведаміў, што да 2027—2030 гадоў 20 % сусветнага аўтапарка будуць складаць электрамабілі. Чакаецца, што паступова электракары выцесняць аўто з рухавіком унутранага згарання.

Нарвегія плануе цалкам адмовіцца ад продажу на тэрыторыі сваёй краіны неэлектрычных легкавых аўтамабіляў да 2025 года. Да 2030-га поўны пераход на машыны з электрычнай цягай запланавалі ў Галандыі, Даніі, Ірландыі, Ізраілі і Ісландыі. Адмовіцца ад аўтамабіляў з бензінавымі рухавікамі ў 2040 годзе збіраюцца ў Францыі, Партугаліі, Іспаніі і Вялікабрытаніі.

Сяргей КУРКАЧ.

• Тым часам

«Мы вырашылі ўключыцца ў гэтую гонку»

На завод «БелДжы» паступілі першыя чатыры цалкам электрычныя электрамабілі Geely Geometry A. Пакуль — для ўсебаковых выпрабаванняў, вывучэння попыту і канкурэнтных пераваг, а таксама для праверкі эксплуатацыйных параметраў у нашых кліматычных умовах.

«Кошт гэтага аўтамабіля не названы, ды і пра вытворчасць электракара гаворка пакуль не ідзе», — падкрэсліў на прэс-канферэнцыі **дырэктар СЗАТ «БелДжы» Генадзь СВІДЗЕРСКІ.**

Электрамабіль Geometry A — гэта седан даўжынёй 4736 мм і колавай базай 2700 мм. Электраматор седана развівае магутнасць 163 конскія сілы, а да сотні кіламетраў у гадзіну аўтамабіль разганяецца за 8,8 секунды.

Электракар аснашчаецца літый-іённай батарэяй у двух варыянтах ёмістасці. Версія на 51,9 кВт·г здольная даць запас ходу 410 км, а батарэя на 61,9 кВт·г дазваляе праехаць 500 км на адной «запраўцы». Заяўлены сярэдні расход энергіі — 13,5 кВт·г на 100 км. Падчас выпрабаванняў плануецца ацаніць хадавыя характарыстыкі ў беларускіх умовах. Па словах Генадзя Свідзерскага, пры тэмпературы, ніжэйшай за плюс 10 градусаў, параметры акумулятара ўжо значна зніжаюцца ў параўнанні са штатнымі характарыстыкамі.

Аўтамабіль мае адаптыўны круіз-кантроль, ёсць сістэмы рэагавання на пешахода, веласіпедыста, утрымання ў сваёй паласе, аўтаматычнай паркоўкі. «Каб нашы выпрабаванні былі больш інфарматыўныя, плануем, што з наступнага тыдня перадаём гэтыя аўтамабілі ў свае дылерскія цэнтры. У іх можна будзе азнаёміцца з дадзенымі машынамі», — сказаў Генадзь Свідзерскі.

Кітайскі Geometry A абсталяваны цэлым россыпам электронных сістэм. На фірменнай зарадной станцыі аўтамабіль зараджаецца з 30 % да 80 % за 30 хвілін.

Дылеры атрымалі заданне збіраць інфармацыю аб пажаданнях беларускіх пакупнікоў, у тым ліку па цане.

Арганізацыя вытворчасці электракара магчымая і ў Беларусі. Аднак для гэтага патрэбен дастатковы попыт. Генадзь Свідзерскі ацэньвае яго ў 5—10 тысяч аўтамабіляў. «Што такое ў нашым разуменні масавы попыт? Гэта каля 10 тысяч аўтамабіляў у год. Калі мы бачым такі рынак, то мэтазгодна несці выдаткі, праводзіць падрыхтоўку да вытворчасці. Вось прыкладны ўзровень. Нават пяці тысяч электрамабіляў хапіла б, каб мы прынялі рашэнне аб падрыхтоўцы вытворчасці», — сказаў ён.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Астравецкі раён

ЖЫЦЦЁ І ПЛАНЫ ГОРАДА ЭНЕРГЕТЫКАЎ

Электробусы, рачныя катамараны і сельскі варкаўт

У горадзе энергетыкаў ёсць дзе працаваць зранку, сілкавацца ў абед і адпачываць увечары. Аднак чакаецца, што да 2030 года насельніцтва Астраўца дасягне 20—22 тысяч. Усім ім трэба будзе недзе жыць, есці і адпачываць, а іх дзецям — яшчэ вучыцца і развівацца. Таму горад працягвае актыўна рэалізоўваць праекты па ўсіх кірунках, арыентуючыся на запыты жыхароў цяперашніх і будучых. Што чакае стары і новы Астравец, карэспандэнт «Звязды» запыталася ў мясцовай улады.

У прагнозах — дэмаграфічны ўсплёск

Астравец — малады горад, які жыве пад дэвізам «Горад, у якім хочацца жыць». Людзі тут жвавыя: бегаюць, ездзяць на роварах, цікавяцца спортам. Па ўсім бачна, што жыццё тут віруе, упэўнены ўлады.

За найноўшую гісторыю горада энергетыкаў (з моманту пачатку будаўніцтва Беларускай АЭС) тут збудаваны дзве сучасныя школы, чатыры дзіцячыя садкі (кожны з басейнам), дом творчасці дзяцей і моладзі. Сёлета завершаць шматфункцыянальны комплекс сацыяльна-культурнага прызначэння, дзе будуць музей, канферэнц-зала, бібліятэка. Пачнуць будаваць новы аўтавакзал са станцыяй электразарадкі. Астравец стане другім у краіне горадам, дзе на гарадскіх маршрутах будуць працаваць электробусы, а з часам, магчыма, яны пойдуць і па раёне.

— Цікава, што пры распрацоўцы комплекснага плана развіцця атамнай станцыі планавалася зрабіць трамвайны маршрут для дастаўкі на АЭС работнікаў, — заўважыў **старшыня Астравецкага райвыканкама Ігар ШАЛУДЗІН.** *— З часам канцэпцыю памянялі, на работу атамшчыкі паедуць на электробусах.*

Сёлета ў горадзе здадуць 59-кватэрны дом і пачнуць наступны 56-кватэрны. У кожным з іх жыллё выдзяляюць сіротам.

— У межах інвестыцыйнай дзяржпраграмы ў маі плануецца здаць дом для работнікаў сацыяльнай сферы. Толькі летась да нас размеркаваліся 150 медыцынскіх работнікаў і 40 педагогаў. Думаю, большасць з іх застанецца ў раёне, і мы зможам прагназаваць пэўны дэмаграфічны ўсплёск, — выказаў спадзеў старшыня. *— Ужо прынялі 14 рашэнняў аб выдзяленні сямейнага капіталу на будаўніцтва жылля. Многія жадаюць будаваць у межах горада сядзібнае жыллё, і да канца года мы павінны атрымаць каля 140 зямельных участкаў пад індывідуальную жылую забудову. Пакуль падцягваем туды інжынерныя сеткі і, думаю, зможам задаволіць запыты ўсіх. Уласнымі дамамі, дарэчы, вельмі цікавіцца моладзь.*

Гандлёвая канкурэнцыя і мары пра алімпійскага чэмпіёна

Пачнуць у Астраўцы і будаўніцтва сучаснага шматпавярховага жылля з магчымасцю размяшчэння на яго першых паверхах адміністрацыйных і гандлёвых памяшканняў.

— Ключавая пазіцыя райвыканкама ў развіцці гандлю абыходзіцца без бюджэтнага фінансавання, задзейнічаць інвестыцыі гандлёвых сетак і прыватнага бізнесу, — акрэсліў старшыня. *— За апошнія гады ў Астравец прыйшлі пяць сетак, якія стварылі на рынку добрую канкурэнцыю. Кропка тут не пастаўлена, развіццё працягваецца. Усе ўчасткі прадаюцца з аўкцыёна. Вось і цяпер адзін на стадыі праектавання, другі — продажу.*

Пры гэтым мясцовыя жыхары выказваюць пажаданне мець шырэйшы асартымент пэўных груп такіх непрадуктовых тавараў, як абутак, адзенне.

— На гэта скіравана далейшае развіццё нашага гандлю, — падключыўся да размовы **намеснік старшыні Павел МІЛЕШКА.** *— У трэцім мікрараёне цяпер будуем не проста гандлёвыя аб'екты ў фармаце пэўнай сеткі, дзе ў зале няма нічога, акрамя харчовых тавараў, а аб'екты, частку плошчы якіх зоймуць прадукты харчавання, частку — нехарчовыя тавары. Пад будаўніцтва аднаго з такіх пунктаў ужо выдзелена больш за 3,5 гектара.*

У раёне вялікую ўвагу звяртаюць на спартыўны кірунак. За апошні час у Астраўцы збудаваныя фізкультурна-аздараўленчы комплекс, стадыён, шматфункцыянальны спарткомплекс «Імпульс». Сёлета пачнецца будаўніцтва крытай лядовай пляцоўкі.

— У нашым раёне прасочваецца развіццё шляху ад дзіцячага садка да вялікага спорту. Мы марым выгадаваць алімпійскага чэмпіёна па плаванні, — падзялілася **старшыня раённага Савета дэпутатаў Ірына ТАЛЬЧУК.** *— Усе сельсаветы Астравеччыны арганізавалі паркі адпачынку, дзе не толькі ёсць гульнявое абсталяванне, але і створаны пляцоўкі для варкаўта. Гэта вельмі зручна: дзіця – на арэлі, а мамы-таты — на турнікі.*

«Атамнае» супрацоўніцтва і медыцынская эканоміка

Мясцовыя кажуць, што Астравец выцягнуў шчаслівы білет праз будаўніцтва Беларускай АЭС. Таму не дзіва, што за гады яе стварэння ў горада склалася цеснае супрацоўніцтва з дзяржкарпарацыяй «Расатам», якая адказвае за будаўніцтва. Гэта абмен дэлегацыямі дзяцей, мастацкімі калектывамі з гарадамі-пабрацімамі Астраўца, некаторыя з якіх знаходзяцца ў рэгіёнах размяшчэння атамных станцый.

— Вельмі важна, што кантакт існуе не толькі паміж адміністрацыямі гарадоў, але і на ўзроўні адукацыйных устаноў, якія ўжо маюць прамыя стасункі. Сёлета ў сябе ў лагеры мы будзем прымаць дзяцей з-за мяжы, а нашы паедуць у Венгрыю. Калі сувязі будуць наладжвацца з такога ўзросту, то ў перспектыве яны, пэўна, будуць больш моцныя і перспектыўныя, — падкрэсліў Ігар Шалудзін. *— У трэцяй школе Астраўца рэалізуецца адзін з праектаў, прапанаваны Расатамам, па стварэнні атам-класа. З пачатковых класаў малым расказваюць, што такое атам і станцыя. Пасля яны кажуць пра гэта бацькам, атрымліваецца пераканаўча.*

Някепска пайшло супрацоўніцтва і ў спорце. Упершыню ў Беларусі ў Астраўцы на тэрыторыі першай гімназіі збудаваны баскетбольны стадыён для гульні «тры на тры». Цяпер ужо амаль уся Гродзенская вобласць удзельнічае ў такіх спаборніцтвах.

Узровень тутэйшай медыцыны таксама перавысіў раённыя межы. Сёлета ў Астраўцы здалі першы пускавы комплекс цэнтральнай раённай клінічнай бальніцы — такім статусам у краіне валодае толькі адна раённая медыцынская ўстанова. А ў перспектыве, пасля ўводу ў чэрвені—ліпені другога комплексу, бальніца стане адным з чатырох рэгіянальных медцэнтраў у Гродзенскай вобласці.

— Акрамя найноўшага сучаснага абсталявання гэта яшчэ і вялікія плошчы, і ўкладзеныя грошы. Яе загрузка павінна абярнуцца не толькі нейкім дэмаграфічным, але і эканамічным эфектам. Мы разлічваем на павелічэнне экспарту медыцынскіх паслуг — да Вільнюса ж адсюль 50 кіламетраў. Паслугі бальніцы будуць карыстацца попытам як у беларусаў, так і ў замежнікаў, асабліва літоўцаў, — упэўнены старшыня.

Адпачынак каля ракі

У межах горада ёсць дзве ракі. Лоша перасякае Астравец з захаду на ўсход, Кавалёўка — з поўдня на поўнач. У іх поймах плануюць стварыць месцы для адпачынку і заняткаў спортам, арганізаваць вела- і пешаходныя сцежкі ўздоўж рэк, цераз лясок. Гэты праект дзеляць на два этапы, і першы рэалізуюць сёлета да канца года.

— Праект па стварэнні пешаходна-рэкрэацыйных зон паблізу жылых мікрараёнаў № 1 і 2 увязваем з рэканструкцыяй адной з вуліц старога горада — Валадарскага, якая вядзе ад першага мікрараёна да цэнтра Астраўца, — удакладніў кіраўнік раёна. — Тут будзе створана новая кальцавая развязка, заменяць інжынерныя сеткі, пашыраць праезную частку, аптымізуюць аўтобусныя прыпынкі, зробяць дадатковыя аўтастаянкі для легкавых аўто.

Ёсць інвестар, які гатовы стварыць забаўляльны дзіцячы цэнтр. Мясцовы прадпрымальнік таксама выкупіў недабудаваны малочны завод, які з 90-х гадоў стаяў незапатрабаваны, і плануе змясціць тут гандлёва-забаўляльны цэнтр. Яшчэ адзін прадпрымальнік прапанаваў у першым мікрараёне на пляжы стварыць летнюю кавярню, зладзіць канатныя дарогі, арганізаваць пэйнтбол, катанне на катамаранах, а ўзімку — на цюбінгах з горкі.

Не забываюцца ў Астраўцы і пра зялёную эстэтыку, каб вока радавалася. Стварацюць габеоны, альпійскія горкі, клумбы, саджаюць дрэвы. Нават падумваюць арганізаваць конкурс на найлепшае ўпрыгожанне тэрыторый прадпрыемстваў і арганізацый, у тым ліку на сельскіх мехдварах і фермах. Што і казаць, работы ў маладога горада наперадзе яшчэ шмат, але работы прыемнай, бо для сябе ж робяць.

ВОДНАЯ, КВЕТКАВАЯ І ЦЕПЛАВАЯ ГАСПАДАРКА

Астравецкія камунальнікі робяць жыццё цёплым і ўтульным

Астравец — горад, які імкліва прырастае не толькі дамамі, а цэлымі вуліцамі і кварталамі. І ўсё гэтае жыллёвае багацце трэба абслугоўваць: забяспечваць цяплом, вадой і светам. Да 2025 года горад энергетыкаў мяркуюць цалкам аснасціць водаправоднай вадой і збудаваць у раёне 11 станцый абезжалезвання. А да 2022-га — заасфальтаваць усе вуліцы Астраўца. Дасягаць гэтых мэтаў актыўна дапамагае Астравецкая ЖКГ, 300 супрацоўнікаў якой займаюцца вадой, каналізацыяй, цеплаі газазабеспячэннем, уборкай прыдамавых тэрыторый і іх добраўпарадкаваннем.

Дырэктар Астравецкага РУП ЖКГ Аляксандр МЕКІН.

ВОДАПРАВОД ЗАМЕСТ КАЛОНКІ

Плануецца, што ў горадзе неўзабаве пазбавяцца ад усіх калонак, ніводная з іх ужо не функцыянуе. А сёлета праложаць водаправод у раёне прыватнай забудоўлі на пяці вуліцах Астраўца. Да сеткі халоднага водазабеспячэння падключаць больш за 100 новых абанентаў. Праект будзе фінансавацца сумесна з жыхарамі.

— Цяпер у гэтых людзей у прыватных домаўладаннях лічы, што няма вады. Летась мы спраектавалі, а сёлета збудуем ім водаправод, а яны змогуць прыйсці да нас, узяць тэхнічныя ўмовы, аплаціць грошы за суфінансаванне і мець магчымасць падключыцца да вады, — патлумачыў **дырэктар Астравецкага РУП ЖКГ Аляксандр МЕКІН.** *— Будаваць сеткі будзем гаспадарчым спосабам, каб жыхарам абышлося танней.*

У межах праграмы «Чыстая вада» для якаснага пітнога водазабеспячэння насельніцтва летась у аграгарадках раёна збудавана тры станцыі абезжалезвання. На сёлета запланавана яшчэ чатыры.

ПАСЛУГІ З РАНКУ ДА ВЕЧАРА

Работа камунальнікаў заўжды насычаная. Гэта замена цеплавых і каналізацыйных сетак, арганізацыя асвятлення, прыборка тэрыторыі, водазабеспячэнне, азеляненне тэрыторый, нават упрыгожанне навагодняй ілюмінацыяй.

— Раніцай прачнуўся ў цяпле, уключыў святло — пачаў спажываць нашу паслугу. Пайшоў чысціць зубы, умывацца — таксама нашымі паслугамі скарыстаўся. Вечарам вяртаешся дадому — гараць ліхтары — і гэта нашых рук справа. Усё жыццё — з ЖКГ, — смяецца дырэктар. *— Усё, ад чаго залежыць жыццядзейнасць чалавека, робім мы.*

Летась пры плане 3,5 тысячы м² капітальна адрамантавалі 6,1 тысячу. Сёлета ў раёне трэба мадэрнізаваць ужо 8,9 тысячы м².

Пры падрыхтоўцы да капітальнага рамонту людзям прапануюцца ўсе паслугі па энергаэфектыўнасці, аднак амаль ніхто не пагаджаецца на гэта, бо пра станоўчыя наступствы ад цепларэнавацыі не задумваюцца, акцэнтуе ўвагу дырэктар.

З гэтага года падчас капрамонту камунальныя службы плануюць мяняць прыборы ўліку водазабеспячэння, каб здымаць паказчыкі гэтага рэсурсу дыстанцыйна. Усе цеплавузлы ўжо дыспетчарызаваны, і да таго ж стану хочуць давесці ваду.

БЕЗТРАНШЭЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

— З будаўніцтвам жылых мікрараёнаў новага горада на наш баланс пачалі прыходзіць дамы, вуліцы і праезды, — успамінае кіраўнік ЖКГ. *— Аднак уся прыдамавая і дваравая тэрыторыя засталася ў АЭС. Тым не менш, па дагаворы мы і там працавалі. З вясны «атамную» гаспадарку стала абслугоўваць прыватная структура. У новым горадзе, аднак мы засталіся манапалістам па вадзе і цяпле. У старым горадзе таксама ўсё ў нашым вядзенні.*

Добраўпарадкаваць і рамантаваць вуліцы астравецкім камунальнікам дапамагае ўстаноўка накіраванага бурэння. Дарагое абсталяванне дазваляе рабіць праколы пад асфальтам, не падымаючы дарожнае пакрыццё падчас бягучага рамонту тэрыторыі. Цяпер яно дапамагае гаспадарцы не толькі працягваць сеткі бестраншэйным спосабам, а яшчэ і дадаткова зарабляць грошы, дапамагаючы падчас рамонту іншым арганізацыям.

Стан асвятлення вуліц таксама на плячах камунальнай службы. Летась рабілі асвятленне па вуліцы Валадарскага, частку святлодыёднымі, дадалі ліхтароў там, дзе не хапала. Эканамічны эфект ад гэтага пакуль не пралічаны, аднак станоўчая сацыяльная рэакцыя ўжо ёсць.

ГЕРАНЬ, БЕГОНІЯ, ЦЮЛЬПАНЫ...

Упрыгожваюць горад мясцовыя азеляніцелі. Уласна вырашчаныя з расады ў дзвюх цяпліцах кветкі неўзабаве расселяцца па клумбах і габеонах Астраўца. Сёлета ўпершыню да 8 Сакавіка вырасцілі дзве тысячы цюльпанаў. Кветкаводы, дарэчы, упрыгожваюць хатнімі раслінамі і памяшканні гаспадаркі.

А ў цяпліцах тут ампельная герань, сальвія, колюс, бягонія, аксаміткі, хрызантэмы, настуркі, астра, цэлозія... Пералічваць усё доўга.

— Месца нам мала, трэба трэцяя цяпліца, — запэўнівае **кветкавод Гражына ЛУКАШЭВІЧ.** *— Вось петунію і сульфінію для вертыкальнага азеляннення толькі высаджваем. Бальзаміну непасрэдна ў касеты высадзім пазней, бо яна надта крохкая.*

— Пакуль ранавата пашырацца. Але збіраемся зрабіць сістэму кропельнага паліву, каб увесь час падтрымліваць неабходную вільготнасць, — абяцае **начальнік участка добраўпарадкавання, азеляннення і санітарнай ачысткі Астраўца Аляксандр КОЎЗАН.**

— У сезон для высадкі зеляніны па горадзе двум работнікам цяпліц наймаюць у дапамогу жанчын-пенсіянераў, — дадае **галоўны інжынер ЖКГ Валерый ГРЫШКЕВІЧ.** *— Гады тры ўжо працуюць у нас і студатрады са школьнікаў. Яны на адмостках дамоў шчыруюць.*

ГАЗАВЫ, НА ШЧАПЕ, ЭЛЕКТРЫЧНЫ

На абслугоўванні камунальнікаў цяпер 322 тысячы м² жылля. Магутнасцяў існуючай кацельні ўжо не хапала, каб нагрэць ваду для такой колькасці жылля, таму ў 2016-м зрабілі яе рэканструкцыю, дабудаваўшы частку кацельнай. Цяпер гэта хіба што не наймагутнейшая цеплакрыніца ў вобласці.

— Сёння магутнасць усёй кацельнай 52,8 Гкал/г і пад такую нагрузку яна функцыянуе на 100 % практычна ў аўтаматычным рэжыме, а ўсяго па раёне вырабілі 90 тысяч Гкал. З іх 12 тысяч на ацяпленне АЭС, 9 тысяч на раён, і 73 тысячы выраблена для горада. Персанал тут задзейнічаны ў асноўным на абслугоўванні катлоў, якія працуюць на

Ларыса МАЛЫШКА, начальнік планава-эканамічнага аддзела — адна са старэйшых работнікаў Астравецкай ЖКГ, яна курыруе эканамічныя паказчыкі гаспадаркі. За паспяховую і адданую працу летась узнагароджана нагрудным знакам «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі».

шчэпе, — патлумачыў галоўны інжынер. *— Функцыянуюць газавы кацёл на 25 Мвт, два катлы па 16 Мвт, два — па 10 Мвт, а таксама катлы на шчапе на 2 Мвт і 4 Мвт. Часткова шчапу робім самі, але ў асноўным купляем. На ацяпляльны перыяд катлам толькі на гэтай кацельнай трэба 16 тысяч м³, а працэс работы з ёй працаёмкі. Яшчэ два гады таму летам на шчапе можна было нагрэць ваду для ўсяго горада, цяпер выкарыстоўваем толькі на 40 %, так што рэзерв ёсць.*

— Абодва водазаборы падключаны ў адну сетку і кампенсуюць адзін аднаго. Яны дыспетчарызаваны і аўтаматызаваны, кіраваць імі можна непасрэдна з мабільнага. Я вось ноччу магу праверыць, ці не спіць аператар. Адключыць насос, каб убачыць рэакцыю, — жартуе галоўны інжынер. *— І званкі ў службу «115» можна адразу праверыць — глянуць, што робіцца.*

Вытворчасць свідравіны глыбінёй 100 метраў на новым водазаборы 100 м³ у гадзіну. Увесь гэты аб'ём ачышчаецца на станцыі абезжалезвання (да 4,5 тысячы м³ вады за суткі). За месяц да спажыўцоў паступае 40—45 тысяч м³ вады.

У гаспадарцы водазабору ёсць таксама помпавая станцыя, два рэзервуары для захоўвання чыстай вады і рэзервовая свідравіна, якая пакуль не працуе. Як толькі горад падрасце, тут дадаткова ўсталююць два новыя фільтры, паставяць помпавае абсталяванне (пляцоўка пад іх гатовая загадзя), створаць рэзервуар для чыстай вады на 500 м³.

— За кошт глыбіні вада тут умоўна чыстая і без апрацоўкі. Хімічны аналіз паказаў перавышэнне толькі па жалезе. Пры дазволенай норме 0,3 мкг/л, у свідравіне было 0,4–0,5. На станцыі мы даводзім гэты паказчык практычна да нуля, — расказаў **начальнік участка вадаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Юрый ДАЎЛЯШ.** *— На станцыі прадугледжана і ўльтрафіялетавае апрамяненне вады, каб пазбавіцца ад мікраарганізмаў.*

Кожны тыдзень ваду возяць на аналіз у смаргонскую лабараторыю. Аднак вясной усе паказчыкі будуць правяраць у мясцовым цэнтры гігіены, дзе ўжо тэсціруюць абсталяванне для гэтай мэты. Так што ўдасканальваецца і развіваецца не толькі горад, але і яго камунальная гаспадарка.

УНП 500018791

ULTRAFIOLET І ЖАЛЕЗА

Пяць каналізацыйна-насосных станцый Астраўца таксама дыспетчарызаваны. А вадой напітваюць горад два водазаборы. Адзін у горадзе, другі, новы, яшчэ паўтара года таму збудавалі ў вёсцы Трайгі спецыяльна для абслугоўвання трэцяга мікрараёна. Аднак да лістапада 2018 года яго не эксплуатавалі, бо хапала патрэб першага.

Па-мастацку аформленыя сцены будынкаў — навінка гарадскога дызайну.



- У цяпліцы падрастаюць кветкі, расада для гарадскіх клумбаў. Пасадкі маладых раслінак аглядаюць начальнік участка Аляксандр КОЎЗАН і кветкавод Гражына ЛУКАШЭВІЧ.
- Станцыя абезжалезвання — адзін з галоўных участкаў на шляху вады ад свідравін да спажыўцоў. Каля ўстановак — начальнік участка Юрый ДАЎЛЯШ.
- Аператар кацельнай № 1 Леанард ТРАХНЕВІЧ.

ОСТРОВЕЦКИЙ ЛЕСХОЗ

ЛЯСНЫЯ ДАРЫ ДЛЯ КОЖНАЙ ПАРЫ

Гадавальнік для елак і вальеры з аленямі Астравецкага лясгаса

Начальнік гадавальніка Надзея ЯРМОЛЬЧЫК і лесавод Вера ВІНАГРАДАВА ў цяпліцы для зялёнага чаранкавання.

Дырэктар ДЛГУ «Астравецкі лясгас» Рыгор ДОЛГІ.

Вырасціць з насення елку, рассяліць мурашоў, выгадаваць муфлона, вытачыць ацыліндраваныя вырабы з дробнатаварнай драўніны, са звычайнай дошкі атрымаць паганажныя вырабы, здабыць трафейнага аленя... Усё гэта ўмеюць у Астравецкім лясгасе, асноўная задача якога — ахова і ўзнаўленне лесу. Зіма для гаспадаркі адносна спакойны перыяд. З надыходам вясны пачынаецца падрыхтоўка да пажаранебяспечнага сезона, клопаты з пасадкамі і змаганне са шкоднікамі лесу.

Жукі-шкоднікі і крамы «Зрабі сам»

Шмат увагі ў лясгасе ўдзяляюць догляду пасаджаных культур і санітарных высечак, своечасовай нарыхтоўцы драўніны, што дасягнула спеласці. Для сасны і елкі гэта, напрыклад, 81 год, для бярозы — 61, асіны — 41.

Раз на дзесяць гадоў праводзіцца лесаўпарадкаванне, або інвентарызацыя лесу, калі ацэньваюць, якія выдзелы трэба высякаць. Чым большыя гэтыя плошчы, тым лепш, бо гэта азначае, што працэнт спелых лясоў павялічыўся — значыць, высякаецца і саджаецца дрэў у меру, усё пралічана. У гэтым рэвізійным дзесяцігоддзі лясгас атрымаў дазвол высякаць 128 тысяч кубаметраў лесу ў год, або 300 гектараў, а пасадзілі летась 350 гектараў, кажа **Рыгор ДОЛГІ, дырэктар Астравецкага лясгаса:**

— Асобная задача — барацьба з насякомымі-шкоднікамі. Асабліва з жуком-караедам, які апошнім часам з-за пацяплення клімату і аслаблення дрэў праз недахоп вільгаці асабліва пагражае лесу. Добра, калі ўсё ў меру. Караед заўжды ёсць у лесе, аднак калі дрэвы здароўя, яны паспяхова змагаюцца з пагрозай. Жукі робяць у кары хады, запаўзаюць туды, а дрэва адтуліны запаўняе смалой, і насякомае не можа выбрацца, гіне. Аслабленае ж дрэва так абараняцца не можа. Жукі адкладваюць лічынкі і могуць загубіць у лесе цэлыя кварталы. А калі сухія гады ідуць адзін за адным, то гінуць мільёны кубаметраў лесу, як было ў Гомельскай вобласці. Паратунку ад караеда, акрамя высечкі, не існуе, тым больш што пры такім надвор'і жукі паспяваюць даць два-тры патомствы за сезон. З вусенямі змагацца прасцей — дастаткова апырскаць дрэвы або сабраць шкоднікаў.

Ляснічы I класа Астравецкага лясгаса Аляксандр ГАЙСА, па сумяшчальніцтве паляўнічы, аматар традыцыйнай і падводнай рыбалкі, сёлета стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу Міністэрства лясной гаспадаркі «Найлепшы ляснічы года». Ён сціпла кажа, што гэта агульная заслуга яго і калектыву, якім кіруе:

— Мы выконвалі нашы рабочыя абавязкі, проста па пэўных паказчыках, накшталт высечкі лесу, доглядзе за ім, абароны ад пажараў былі крыху лепшыя. Першачарговая задача лесніка стварацца, ахоўваць і прымнажаць нашы лясныя багацці, а пасля ўсё астатняе.

Біялагічны метад барацьбы з ворагамі лесу — развешваць на дрэвах сінічнікі і шпакоўні, агароджваць і рассяляць мурашнікі. Тут дапамагчы можа і надвор'е: дажджы стабілізуюць сітуацыю і спыняюць жукоў-караедаў. Летась аб'ём высечаных на Гомельшчыне дрэў ужо крыху зменшыўся. Астравецкія леснікі таксама дапамагалі ратаваць гомельскія лясы, як і ўся краіна.

З года ў год у лясгасе працуе і паралельна мадэрнізуецца дрэваапрацоўчы цэх. Сёлета пачала работу лінія сарціроўкі драўніны. 40 % усёй прадукцыі лясгаса экспартуецца, а піламатэрыялаў дык увогуле адпраўляецца за мяжу 70 адсоткаў. Ацыліндраваныя вырабы, якія выточваюцца з дробнатаварнай драўніны, ідуць за мяжой на добраўпарадкаванне і іншыя мэты. Карыстаюцца попытам і дошка для падлогі, вагонка, рэйка, імітацыя брусу, ліштвы, паліўныя брыкеты з апілак, шчапа... Усё гэта таксама робяць ва ўстанове, а ў апошні час забяспечваюць гэтым таварам і сталічныя крамы «Зрабі сам».

— Працуем у асноўным пад заказчыка. Выстаўляем на біржы лоты з пэўнымі памерамі і пасля іх набыцця ўжо дакладна робім тое, што закажа пакупнік, — тлумачыць кіраўнік гаспадаркі.

Елка, туя, айва, кізіл...

Штогод да гаспадаркі далучаюцца няўдобіцы і рэкультываваныя пляцоўкі, якія таксама трэба засаджваць. Для гэтага ёсць прадукцыя лесагадавальніка, які існуе з 2012 года, і дзе хапае саджанцаў і на аднаўленне лясных угоддзяў, і на продаж у Беларусь і Расію. А апошнія гады лесаводы экспартуюць насенне елкі нават у Швецыю.

На 12,1 гектара лесагадавальніка растуць елка, сасна, бяроза, апошнім часам стала больш чорнай алешыны, клёнаў. Высаджваюць дуб, ясень, ліпу. Тут уласны вадавод, электрычнасць, пяць цяпліц, у кожнай з якіх свой рэжым тэмпературы і паліву ў залежнасці ад тэхналогіі вырошчвання раслін.

— У сувязі з пашырэннем жылой забудовы ранейшы лесагадавальнік давялося ліквідаваць, бо Астравец становіцца ўсё большы, — расказвае Віктар ЛЯХ, галоўны ляснічы Астравецкага лясгаса. — Аднак мы не вельмі засмучаліся, бо глеба там была ўжо не надта якасная, таму ў самы кароткі тэрмін стварылі новы гадавальнік. У нас з работнікамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі адна мэта — зрабіць наш горад атамшчыкаў сучасным, прывабным, экалагічна чыстым, упрыгожаным дрэвамі, кустамі, кветкамі... Вось і імкнёмся, як кажуць, зрабіць з яго горад будучыні. Сёння калектыў лесагадавальніка нарошчвае колькасць раслін для ўжо ўсталяваных схем азелянення.

Для гэтага вырошчваюць 100 формаў і відаў розных дэкаратыўных раслін. Ядловец, туі шарападобныя, калонападобныя, пірамідальныя, нават адзіны экзэмпляр экзатычнай змеепадобнай (усяго каля 20 разнавіднасцяў), елкі ў кадках, ціс ягадны, дзёран белы, айва, брызгліна, кізіл, гартэнзія дрэвападобная, спірэя японская, ірга канадская, снежнаягаднік белы, бружмель... Пералічваць можна доўга.

А ўвогуле пры правільнай высечцы-высадцы нам лясоў хопіць назаўсёды.

Растуць-падрастаюць у гадавальніку дрэўцы будучых хвойных бароў.

Трафейнае паляванне і ўрокі біялогіі

Клопат лясгаса — гэта яшчэ і паляўнічая гаспадарка, плошча якой каля 33,3 тысячы гектараў. Частка гэтай тэрыторыі (220 гектараў) — вальера, дзе гадуюць еўрапейскую лань, муфлона, плямістага і высакароднага аленяў. Звяроў, як і дрэвы, прадаюць у краіне і за мяжу.

Часта прыязджаюць замежныя паляўнічыя, прычым не толькі на паляванне, але і дзеля экатурызму: прайсціся па экалагічнай сцяжыне, паназіраць за жыццём звяроў, адпачыць у паляўнічых дамках. Амаль з такой жа мэтай наведваюцца і дзеці, для якіх экскурсія — своеасаблівы практычны ўрок біялогіі.

— Традыцыйна да нас прыязджаюць расійскія паляўнічыя, летась былі турысты з Польшчы, Славакіі, — расказвае кіраўнік гаспадаркі. — Нядаўна скончылася паляванне на капытных, цяпер усе чакаюць адкрыцця палявання на гуся, качку, вальдшнэпа. Летам пачнецца трафейнае паляванне на казулю, а ўвосень — лася, аленя. У правілах палявання дакладна прапісана, на каго можна паляваць і калі. Адзінае выключэнне — дзік. На яго цяпер палююць круглы год. У сувязі з афрыканскай чумой свіней — дзік быў прызнаны яе пераносчыкам, таму пастаўлена задача максімальна зменшыць яго папагалоўе, каб знішчыць пагрозу.

Галоўны ляснічы Віктар ЛЯХ аглядае прычапны інвентар для работы ў гадавальніку.

Для экатурыстаў па лесе распрацаваны веласіпедныя і пешыя маршруты, адзін з якіх звязвае дом паляўнічага з вальерай. У прынцыпе, асноўная частка маршруту пралягае як раз па вальеры, дзе зроблены спецыяльныя назіральныя вышкі, каб звяроў гарантавана можна было ўбачыць. Абсталявалі і спецыяльныя пляцоўкі, адкуль узімку цікава назіраць, як спецыялісты кормяць лясных насельнікаў.

— Першапачаткова вальера будавалася для павелічэння пагалоўя высакароднага аленя, — успамінае Рыгор Долгі. — Папуляцыя добра аднавілася, і цяпер на іх можна паляваць. Неаднаразова нашы трафеі займалі і займаюць прызавыя месцы на рэспубліканскіх выстаўках. Пасля па праграме Міністэрства лясной гаспадаркі мы закупілі для вальеры еўрапейскую лань, затым — муфлона. Яны таксама павялічылі папуляцыю, і цяпер мы іх прадаём іншым гаспадаркам або прапануем паляўнічым у якасці трафея. Пры гэтым статус вальеры памянялі на паляўнічы, пры якім жывёл можна здабываць. Асабліва ў гэтым зацікаўлены трафейшчыкі, якім раней даводзілася ездзіць дзеля гэтага за мяжу. Многія любяць экзатычны спосаб палявання з лукам ці арбалетам. І мы стварылі ў вальеры такую магчымасць вярнуцца ад сучаснай зброі да прасцейшай, каб зраўняць шанцы звера і чалавека.

Сярод супрацоўнікаў лясгаса, дарэчы, сустракаецца нямала заўзятых паляўнічых. Тут гавораць, што арганізацыя палявання — гэта работа, якую немагчыма вытрываць, калі ты сам не палюеш і не любіш гэтую справу.

Тут вырошчваюць папулярныя высакарослыя буякі Nortland.

УНП 500018656.

Паліглоты вучацца ў Рымдзюнах

Цэнтр культуры, інфармацыі і адукацыі, школа з навучаннем на літоўскай мове, беларуская школа... Непаўторная трыяда аграгарадка Рымдзюны Астравецкага раёна злучана адным дахам і адзінай мэтай — даць дзецям добрую адукацыю. Унікальнасць гэтай установы не толькі ў выкладанні прадметаў выключна на беларускай або літоўскай мовах у адпаведных школах, а яшчэ і ў тым, што мясцовыя вучні часам атрымліваюць проста індывідуальнае навучанне. Нават калі займацца збіраецца толькі адзін малы, для яго адкрыюць клас адпаведна ўзросту. Лагічна, што пры такім узроўні выкладання ведаў тутэйшыя выпускнікі свабодна паступаюць у ВНУ.

Багдан СІДАРАЎ і Святлана ДУЛЬКО — дзевяцікласнікі Рымдзюнскай сярэдняй школы з літоўскай мовай навучання.

Цяпер у школе 63 вучні з літоўскім навучаннем і 29 дзяцей — з беларускамоўным. Усяго тут могуць займацца 100 школьнікаў, а два, чатыры, пяць вучняў у класе — норма.

У літоўскай школе 21 настаўнік, 11 з якіх — літоўцы. Моўная нагрузка школьнікаў таксама ўражвае: літоўская, руская, беларуская, англійская. Актыўныя вучні з літоўскай школы па суботах дадаткова наведваюць міжшкольны факультатыў на базе гімназіі ў Астраўцы, дзе паглыбляюць веды па англійскай мове.

— Займаюцца тут не толькі вучні з Астравеччыны, але і сем чалавек з Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў. Тыя, каму далёка штодня вяртацца дадому, жывуць у школьным інтэрнаце — проста ў школе арганізаваны спальныя пакоі для 32 чалавек. Штогод тут пражываюць 20 вучняў, — расказала **Алеся КАШКО, намеснік начальніка аддзела адукацыі Астравецкага райвыканкама.**

Акрамя вучобы, пражывання і харчавання, малыя займаюцца спортам у спартзале і паглыбляюць веды ў... музеі. Ды не ў адным, а двух. У літоўскай школе ёсць музей-пакойчык, дзе экспануюцца непаўторныя рэчы накшталт маленькіх вагаў для ўзважвання солі і тытуню і сапраўдных літоўскіх пашпартоў пачатку XIX стагоддзя. Гаспадыня гэтага музея Галіна не толькі захоўвае рэчы і вывучае іх гісторыю, але і дапамагае дзецям прычыніцца да даўніны праз розныя вырабы. Разам яны майструюць маскі на Масленіцу, яйкі на Вялікдзень, тэматычныя рэчы на іншыя святы: вышыванкі, выцінанкі.

А ў большым памяшканні, у Цэнтры культуры, інфармацыі і адукацыі, змешчаны вялікі музей, дзе паказаны куток старажытнага мясцовага побыту. Тут сабраныя рэчы, якія адлюстроўваюць жыццё Гервяцкага краю. Больш за 450 экспанатаў падзелены на тэматычныя зоны: «Дарога льну», «Крылы рушніка», «Жыццё і быт», «Друкаваныя вырабы». Побач з музеем ёсць маленькі куточак, які ўяўляе сабой пакойчык старадаўняй беларускай хаты.

Гэты музей таксама будзе павялічвацца, абяцаюць тутэйшыя спецыялісты і мараць калісьці стварыць асобны паўнавартасны музей Гервяцкага краю, які б стаў цікавай установай для ўсёй краіны.

— Суседства і жыццё пад адным дахам дае нам шмат магчымасцяў, — паказала нам адну з мясцовых разынак, вялізную актавую залу на 250 чалавек (у тым ліку 80 месцаў на балконе) **Наталля БЕЛЯЧЫЦ, загадчык аддзела культуры і вольнага часу аграгарадка Рымдзюны.** *— У нас тут выступаюць не толькі беларускія артысты, але і літоўскія. Адбываюцца і спектаклі. І гледачы, вядома, таксама не толькі нашы вучні, але і жыхары ўсяго раёна.*

Мы хочам, каб нас ведалі, да нас прыязджалі, кажуць тут і робяць дзеля гэтага ўсё магчымае. Гэтае месца, куды цягне зноў вярнуцца, каб падзівіцца.

У школьным музеі захоўваецца вялікая калекцыя ўзораў творчасці вясковых майстроў.

ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ УСІХ УЗРОСТАЎ

Першая ў Беларусі цэнтральная раённая клінічная бальніца і самая тэхналагічна ўкамплектаваная (каля 5000 адзінак абсталявання) установа ў Гродзенскай вобласці знаходзіцца ў Астраўцы.

Шматфункцыянальны высокаспецыялізаваны лячэбны цэнтр для медыцынскай дапамогі месцічам і жыхарам сумежных раёнаў Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей, разлічаны на 382 койкі, пачаў працаваць 31 студзеня.

Пакуль здадзена толькі першая чарга з трох карпусоў, дзе працуе 13 аддзяленняў, пяць з якіх міжраённыя. Неўралогія, кардыялогія, тэрапія, хірургія, аддзяленне педыятрыі і акушэрска-гінекалагічнае — у першым корпусе. Аддзяленне прамянёвай дыягностыкі, пераліванне крыві і водагразелячэбніца — у другім. Рэанімацыя і рэабілітацыя, лабараторыя, аперацыйны блок, ангіяграфія — у чацвёртым.

Галоўны ўрач Уладзімір МАЖЭЙКА.

— Тут адкрыты рэсурсныя цэнтры, якія аказваюць дапамогу пры вострым парушэнні мазгавога кровазвароту, вострым каранарным сіндроме, а таксама сур'ёзная дыягнастычная база, — расказаў **галоўны ўрач бальніцы Уладзімір МАЖЭЙКА.** *— Установа валодае моцнай лячэбнай базай і высокім рэабілітацыйным патэнцыялам. Такім чынам мы можам аказаць комплекс паслуг: ад дыягностыкі да лячэння і рэабілітацыі людзям усіх узростаў. Мы арыентуемся на павышэнне якасці жыцця пацыентаў. Многія працэдуры разлічвалі ў тым ліку як санаторныя. Мы можам абследаваць і праводзіць рэабілітацыю работнікаў буйных прадпрыемстваў.*

Бальніца вельмі запатрабавана, бо насельніцтва Астраўца расце, што называецца, па гадзінах, і мясцовыя, а таксама жыхары суседніх раёнаў маюць патрэбу ў дадатковых даследаваннях — у прыватнасці, у камп'ютарнай тамаграфіі і магнітна-рэзанансная тамаграфіі (МРТ). У вобласці толькі тры апараты МРТ: у гродзенскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, універсітэцкай клініцы ў Гродне і ў Астраўцы. Наяўнасць такога абсталявання зняла пытанне чаканняў медыцынскай дапамогі і павысіла якасць гэтай паслугі. А геаграфічнае размяшчэнне Астраўца дазваляе прапанаваць паслугі новай бальніцы і на экспарт, падкрэсліў галоўны ўрач.

Медыкі аддзялення прамянёвай дыягностыкі рыхтуюцца да чарговага прыёму пацыентаў.

Палаты тут разлічаны на двух чалавек і абсталяваны кнопкамі выкліку медсясцёры, а ў калідорах яшчэ пахне свежай драўнінай. Каб не заблытацца ў шматлікіх павароты і пераходах, на сценах паказальнікі напрамку, што вельмі зручна.

Паколькі бальніца клінічная, гэта азначае супрацоўніцтва з медыцынскімі установамі.

— Ужо дасягнутае пагадненне аб адкрыцці філіялаў чатырох кафедраў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, — дадаў Уладзімір Мажэйка. *— Тут будуць дыстанцыйна і вочна вучыцца студэнты і спецыялісты са стажам з розных рэгіёнаў краіны. Так што на нашай базе найлепшым чынам спалучаюцца практыка і навука, існуе магчымасць укаранення сучасных распрацовак адразу ў практыку.*

Пасля здачы яшчэ двух карпусоў летам бальніца атрымае статус міжраённай. Тут з'явяцца траўматалагічны цэнтр, перынатальны цэнтр другога ўзроўню і міжраённае інфекцыйнае аддзяленне. Будавалася бальніца па індывідуальным праекце і абышлася ў 127 мільёнаў рублёў.

АД ПАДМУРКА ДА ДАХУ

Упраўленне «Гроднапрамбуд-Атам» будуе дамы і вуліцы новага Астраўца

Аб'екты атамнай станцыі, 18 жылых дамоў, тры дзіцячыя садкі, новая бальніца, водазабор, усходняя абходная дарога, пагранзастава — усё гэта зроблена з удзелам работнікаў будаўнічага ўпраўлення «Гроднапрамбуд-Атам», якое стала адным з падраздзяленняў таварыства «Гроднапрамбуд» падчас будаўніцтва Беларускай АЭС. Менавіта на самай буйной будоўлі краіны амаль сем гадоў таму пачалася гісторыя прадпрыемства, якое цяпер па праву лічыцца стваральнікам жылля і найважнейшых сацыяльных аб'ектаў у трох новых мікрараёнах горада энергетыкаў і нават па-за яго межамі.

У гэтым новым мікрараёне Астраўца працавалі будаўнікі БУ «Гроднапрамбуд-Атам».

Уладзімір Аляксандравіч АЎЧАРЭНКА

Начальнік будаўнічага ўпраўлення «Гроднапрамбуд-Атам» — чалавек па праўдзе ўнікальны. Яго будаўнічы вопыт налічвае без малага амаль 45 гадоў. За гэты час ён паспеў збудаваць амаль што два беларускія гарады.

38 гадоў спатрэбілася на шчыраванне ў Смаргоні — яго стараннямі жыллём тут забяспечаны 20 тысяч чалавек. Вясною споўніцца сем гадоў, як ён узводзіць і добраўпарадкоўвае Астравец. А калі ўспомніць, што пра прафесію будаўніка Уладзімір Аляксандравіч марыў з дзяцінства, то дакладна атрымліваецца, што гэта справа ўсяго яго жыцця.

Яго працоўны шлях на першы погляд здаецца звычайным. Пасля арміі скончыў факультэт грамадзянскага і прамысловага будаўніцтва ў політэхнічным інстытуце. Там жа сустрэў свой лёс — Людмілу, з якой і прыехаў на першае месца працы ў Смаргонь. Прайшоў шлях ад майстра, прараба, галоўнага інжынера да дырэктара будаўнічага трэста № 41. Неаднойчы быў адзначаны рознымі граматамі.

Здавалася б, вось яно — 40 гадоў працы за плячыма. Створана цэлая прафесійная дынастыя — старэйшая сястра Зоя і сын Аляксандр таксама абралі будаўнічую прафесію. Цяпер самы час адпачыць. Уладзімір Аляксандравіч пайшоў на пенсію. На месяц!

2 мая 2013-га няўрымслівы 60-гадовы прафесіянал узначаліў толькі што створанае прадпрыемства — будаўнічае ўпраўленне «Гроднапрамбуд-Атам». Кажа, што не змог утрымацца, каб застацца ў баку ад будоўлі стагоддзя — Беларускай АЭС. Акрамя гэтага за няпоўныя сем гадоў збудаваў яшчэ і горад энергетыкаў — тры мікрараёны новага Астраўца.

Летась, акурат да прафесійнага свята — Дня будаўніка — атрымаў званне ганаровы будаўнік, а партрэт Уладзіміра Аўчарэнкі красуе на раённай Дошцы гонару.

«Прыемна, калі ацэньваюць тваю працу станоўча. У 60 гадоў яшчэ былі сілы і здароўе, не хацелася заставацца ў баку ад вялікай атамнай будоўлі. Цяпер, аддаўшы шмат сіл, не ведаю, ці не вярнуся на адпачынак, — разважае Уладзімір Аўчарэнка. — Аднак такая напружаная праца таго каштавала, я ганаруся сваім укладам і ў развіццё Астраўца, і ў будаўніцтва АЭС».

Тым не менш, хоць вялікая будоўля і канчаецца, застаецца будаўніцтва горада. Раённы цэнтр будзе развівацца, і яму, вядома, патрэбна будаўнічая арганізацыя з прафесійным кіраўніцтвам. Акрамя таго, у жыцці актыўнага будаўніка ёсць яшчэ некалькі незаваяваных вяршынь. Горад атамшчыкаў пакуль не дабудаваны, так што Уладзіміру Аляксандравічу ёсць да чаго імкнуцца. І чалавеку з такім вопытам вяртацца на пенсію яшчэ пакуль вой як рана. Хоць ужо цяпер начальнік упраўлення можа працаваць гідам-экскурсаводам і расказваць сваім унукам, як дзед два гарады будаваў.

Жылыя і адміністрацыйныя метры

Муляры, сантэхнікі, апрацоўшчыкі, электрыкі... Ва ўпраўленні працуюць майстры на ўсе рукі, якія здольныя літаральна і будынак з нуля ўзняць, і дарогу пракласці, і водазабор збудаваць, і пагранзаставу, ды і як добраўпарадкаваць тэрыторыю ведаюць і ўмеюць. У прыдатнага да любой работы калектыву ёсць нават свой лагатып і песня. А яшчэ яго супрацоўнікі стварылі каманду «Без касак», якая ўдзельнічае ў інтэлектуальных гульнях раёна.

Большасць работ па будаўніцтву АЭС выконвала і выконвае вядучая будаўнічая арганізацыя ў краіне — аб'яднанне «Гроднапрамбуд». Менавіта з лёгкай рукі яго генеральнага дырэктара Абдулвагаба Вагабава 2 мая 2013-га і пачало работу тутэйшае «атамнае» упраўленне для кіравання, што называецца, па месцы. А на плечы начальніка будаўнічага ўпраўлення «Гроднапрамбуд-Атам» Уладзіміра Аўчарэнкі лягла адказнасць за дапамогу ў будаўніцтве атамнай станцыі і яшчэ большая — за стварэнне самога горада атамшчыкаў: дамоў, садкоў, дарог, вуліц...

— *У першы раз, як сустрэліся, тут не было ні сцяла, ні крэсла — усё ледзьве не на падаконні рабілі,* — са смехам успамінае начальнік. — *Будынак быў, а кабінеты стаялі пустыя.*

Першасны аб'ект, на які скіравалі сілы прадпрыемства, — атамная станцыя. На ёй пашчыравалі ўсе ўпраўленні Гроднапрамбуду. А спецыялісты «атамнага» падраздзялення пачыналі з будаўніцтва вытворчай базы для атамнай станцыі: рабілі дарогі, пракладвалі сеткі, займаліся добраўпарадкаваннем. Шмат было зроблена за мінулыя сем гадоў, і цяпер на АЭС засталіся мінімальныя работы. Апрацоўкай займаецца БУ № 221, а «гроднапрамбудатамаўцы» падцягваюць тыя аб'екты, якія не закончылі іншыя трэсты. Па ўсяму відаць, што неўзабаве галоўная будоўля скончыцца, і ўвага прафесіяналаў сканцэнтруецца на сацыяльнай частцы жыцця Астраўца.

Брыгадзір Дзмітрый ШЧАСНЫ.

Дарэчы, з самага пачатку свайго існавання ўпраўленне было самым актыўным будаўніком сацыяльных аб'ектаў горада. Спачатку паўстаў жылы будынак № 17 у першым мікрараёне, у якім пачыналі з аддзелачных работ. Потым збудавалі дамы № 12, 9, 15, 3, інфармацыйны цэнтр Беларускай АЭС з уводам у эксплуатацыю жылога дома № 1. 4 лістапада 2015 года будаўніцтва мікрараёна № 1 было завершана.

Паралельна ішло будаўніцтва жылля ў другім мікрараёне. 96-кватэрны дом, дзе акрамя кватэр размясціліся кафэ «Ланч», дзіцячая бібліятэка, міліцыя і ЖЭС, стаў упрыгажэннем гэтага квартала. Пасля будаўніцтва мікрараёна № 2 узводзілі дамы ў трэцім, Цэнтральным мікрараёне.

Цяпер, за няпоўных сем гадоў, на рахунку Гроднапрамбуд-Атам ужо 87 тысяч квадратных метраў збудаванага жылля, а гэта 285 кватэр для атамшчыкаў. Хоць гэта і шмат, аднак горад расце настолькі хутка, што патрэба ў жыллі ў горадзе і раёне для звычайных жыхароў не спыняецца. Таму работы ў прадпрыемства дагэтуль шмат.

Інжынер вытворчага аддзела Ірына БАРАНАВА, бухгалтар Галіна КАРДЗІС, галоўны бухгалтар Валерый ІВАНЧЫК, эканаміст Нэля СІДАРУК.

«атамнага» падраздзялення. Другі корпус цэнтральнай раённай бальніцы, дзе размесціцца сучасны радзільны дом, — аўтарства Гроднапрамбуд-Атам. Аб'ект, могуць умясціць па 190 дзетак, а трэці (у цэнтральным мікрараёне) — адразу 230 малых. Калі дагэтуль у Астраўцы і была напружанасць з такімі ўстановамі, то цяпер, думаецца, праблема вырашана, і пытанняў з месцам гадавання маленькіх жыхароў не ўзнікне.

Дзіцячы садок-яслі № 4 узведзены БУ «Гроднапрамбуд-Атам» летась.

За добраўпарадкаванне дарогі ў новым мікрараёне адказвае прараб Валерый КАРЖАНОК.

Будуюць спецыялісты Гроднапрамбуд-Атам і гарадскія вуліцы. Рэканструявалі Валадарскага і Кастрычніцкую. Пракладка інжынерных сетак і водаправода, наладка асвятлення на вуліцы і ў дамах, добраўпарадкаванне тэрыторыі — таксама іх рук справа. Усходнюю абходную дарогу і мост цераз раку Лоша таксама рабіла ўпраўленне. Аўтатраса аб'яднала першы і другі мікрараёны Астраўца і злучыла стары і новы горад.

Дарога значна скараціла адлегласць з пляцоўкі АЭС да другога мікрараёна. Прычым гэта не проста шлях, а сучасная чатырохпалосная дарога са сцежкамі для пешаходаў і веласіпедыстаў, з мостам і ўпарадкаванай пляжнай зонай.

Радзільня, садкі, дарогі...

Акрамя жылля Гроднапрамбуд-Атам прыклала руку да будаўніцтва водазабору № 2 і пагранзаставы «Каменны Лог». Стварэнне сучаснай бальніцы таксама не абышлося без як мяркуецца, здадуць летам, цяпер там завяршаюць апрацоўчыя работы.

У 2018-м, да 550-годдзя Астраўца, будаўнікі падарылі гораду аўтастаянку на 216 машын. А апошнія тры гады ўпраўленне радуе месцічаў важнымі «дзіцяча-стратэгічнымі» аб'ектамі. З 2017-га да 2019-га горад папоўніўся трыма садкамі на 610 месцаў. Два з іх (у другім мікрараёне) *замяніць яго было цяжка. Напачатку нашага станаўлення людзі да нас ішлі, пакідаючы папярэднія месцы, пасля некаторы час ад нас сыходзілі. Але ж цяпер усе ўцягнуліся, калектыў стабільна спрацаваўся,* — разважае начальнік упраўлення. — *Без працы не сядзім. У іншых упраўленнях існуе пэўная спецыялізацыя, нашы ж людзі могуць рабіць усё. Цяпер, напрыклад, няма прац па цагляным мураванні, дык муляры працуюць на добраўпарадкаванні: займаюцца тратуарнай пліткай, ставяць бардзюры.*

Напрыканцы мінулага года аб'яднанне «Гроднапрамбуд» здало чатыры жылыя дамы. Адзін з іх, 64-кватэрны плошчай 4640 метраў квадратных, — аўтарства «атамнага» ўпраўлення. Дом зрабілі «пад ключ», і рабочыя, як ужо павялося, скончыўшы адзін фронт работ, пераключалі сваю спецыялізацыю на іншы. Тыя ж муляры, напрыклад, рабілі і добраўпарадкаванне, і аддзелку.

Мясцовыя жыхары адзначаюць не толькі прафесійнае выкананне работ будаўнікамі, але і ўражваюцца, як прыгажэюць кварталы пасля стварэння. Як ні круці, а выкананне работ ад будаўніцтва да добраўпарадкавання аднымі рукамі пакідае след дакладнай завершанасці. Тым больш што ўсе аб'екты здаюцца ў час. Таму не дзіва, што калектыву давяраюць работу любога ўзроўню.

— *Сацыяльныя аб'екты ў Астраўцы будуць працягваць актыўна будавацца. Магчыма, і прамысловыя сюды з часам падцягнуцца, бо першапачаткова ж і планавалася, што тут размесціцца прадпрыемствы з вялікім аб'ёмам энергаспажывання,* — мяркуе начальнік упраўлення. — *Будуць добраўпарадкоўвацца і вуліцы ў старым горадзе, і мы там таксама возьмем удзел па пракладцы камунікацый і добраўпарадкаванні.*

Прафесійна, прыгожа, у час

Працуюць у Гроднапрамбуд-Атам не толькі месцічы, а і рабочыя з суседняй Смаргоні, Ашмян. Штодня іх прывозяць на работу.

— *Як ні круці, але гарадок маленькі. Калі які-небудзь спецыяліст пераходзіў на іншае месца працы, як мяркуецца, здадуць летам, цяпер там завяршаюць апрацоўчыя работы.*

Прыходзіш у пустое поле, а пакідаеш жылы квартал

Асноўныя сілы «атамнага» ўпраўлення цяпер скіраваны на работу ў трэцім, Цэнтральным, мікрараёне горада. Сёлета стараннямі будаўнікоў тут павінен з'явіцца шматфункцыянальны комплекс сацыяльна-культурнага назначэння і творчасці моладзі. Па плане тут будуць размяшчацца выставачны павільён, боўлінг, бібліятэка, канцэртная зала, разнастайныя гурткі. Працягнуць стварацца і дамы з вуліцамі.

— Скрынінгавыя праграмы, якія мы ўкараняем, дазваляюць скараціць смяротнасць ад раку і інвалідызацыю, прадухіліць перадпухлінныя захворванні, якія прыводзяць да раку, палепшыць якасць жыцця і яго працягласць. Акрамя гэтага, дзякуючы ім можна знізіць колькасць затрат на лячэнне аднаго пацыента. Комплекс медыцынскіх, сацыяльных і эканамічных аспектаў сведчыць пра высокую эфектыўнасць гэтых праграм, — рэзюмаваў Вячаслаў Сільчанка.

ПЕРШЫЯ Ў СВЕЦЕ

Беларускія хірургі перасадзілі нырку разам з установай кахлярнага імплантата

У Беларусі ўпершыню ў сусветнай практыцы праведзена сімультантная (сумесная) аперацыя — 23-гадовай дзяўчыне адначасова трансплантавалі нырку і кахлярны імплантат.

Брыгада амаль з 30 спецыялістаў Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі на чале з намеснікам дырэктара Алегам Калачыкам і РНПЦ слыху на чале з Марынай Пясоцкай шэсць гадзін праводзілі аперацыю. Складанасць была ў тым, што ў дзяўчыны дыягнаставана першасная імунная трамбацытапенія, якая не дазволіла б зрабіць другую аперацыю. Беларускія хірургі першыя ў свеце выканалі ўмяшанне, якое дазволіла дзяўчыне не выбіраць паміж слыхам і здароўем нырак.

Тэмпература нармальная, тэсты адмоўныя

Трое пацыентаў вылечаны ад каранавіруса

Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН, у студэнта з Ірана атрыманы трэці адмоўны вынік тэста. У двух пацыентаў, з якімі ён блізка кантактаваў, на сёння таксама атрыманы адмоўныя тэсты.

— На гэтым тыдні пасля завяршэння мерапрыемстваў лабараторнага і клінічнага кантролю ўсе тры пацыенты будуць выпісаны са стацыянара, — запэўніла Юлія Барадун.

Стан астатніх пацыентаў, у якіх быў дыягнаставаны COVID-19, здавальняючы. Тэмпература нармальная, праводзяцца лабараторны кантроль і мерапрыемствы медыцынскага назірання.

Што датычыцца тых, хто адносіцца да кантактаў першага ўзроўню пацыентаў, якія вярнуліся з Італіі, — у якіх у выхадныя прыйшлі тры іх станоўчыя тэсты — то на сёння вынікі аналізаў на наяўнасць РНК каранавіруса пацвердзіліся.

— Гэтыя пацыенты адчуваюць сябе здавальняюча, тэмпература нармальная, скаргаў няма. Прэвентыўная іх ізаляцыя і адэкватнае медыцынскае суправаджэнне дазволілі не дапусціць далейшага развіцця хваробы і яе распаўсюджвання, — падкрэсліла прэс-сакратар.

Цукровы дыябет можна прадухіліць

Па выніках мінулага года амаль у 10 % беларусаў, а гэта каля мільёна чалавек, выяўлены эндакрынныя паталогіі. На першым месцы ў гэтым спісе цукровы дыябет, прычым другога тыпу. Вялікую частку займае паталогія шчытападобнай залозы.

— У Беларусі зафіксавана 370 тысяч выпадкаў цукровага дыябету, прычым 335 тысяч прыпадае на дыябет другога тыпу, і да 400 тысяч выпадкаў паталогій шчытападобнай залозы. Астатнія 150 тысяч выпадкаў адносяцца да іншых эндакрынных паталогій, — расказала **галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталля КАРЛОВІЧ.**

Яна адзначыла, што эндакрынныя паталогіі можна падзяліць на дзве катэгорыі. У выпадку першаснай паталогіі, да якой ёсць генетычная схільнасць, праводзіць прафілактыку крайне складана і нават немагчыма (напрыклад, дыябет першага тыпу, паталогіі шчытападобнай залозы). Развіццё другасных (сярод іх дыябет другога тыпу) можна спыніць пры дапамозе прафілактычных мер і здаровага ладу жыцця.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Чалавек на зямлі

СТО ЗАЛПАЎ САЛЮТУ Ў ГОНАР ВЕТЭРАНА!

Мой дзядуля Эдуард Сямёнавіч Дзяўго жыве ў вёсцы Еленка Маладзечанскага раёна. Ён ваяваў на 1-м Беларускім фронце пад камандаваннем маршала Ракасоўскага, у складзе 32-га пяхотнага палка прайшоў шлях Беласток—Варшава—Кёнігсберг, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені і Чырвонай Зоркі, дзясяткамі медалёў.
Нягледзячы на ўзрост (а дзядулі ні многа ні мала сто!), ён нястомны апавядальнік і цікавы суразмоўца. З ім можна пагаварыць на самыя розныя тэмы, аднак першая і галоўная для яго — вайна.
Што-нішто з яго ўспамінаў адкрыла для мяне новыя цікавыя факты, падрабязнасці з гісторыі нашага роду і рэалій часу.

— Помню ўсё, як быццам яно ўчора было, — не раз прызнаваўся дзядуля. — У тую нядзелю мы, хлопцы з Еленкі і ваколіц, пайшлі ў Дубровы (гэта суседняя вёска) на заняткі па ваеннай падрыхтоўцы. Там і пачулі, што вайна пачалася, але нам не верылася: усё ціха было, нічога не чуваць. Вярнуліся дадому, ноч перажылі, а назаўтра прачнуліся — самалёты равуць...

Першы час мы дома на гаспадарцы былі. У войска прызвалі значна пазней, пасля вызвалення Беларусі, разам з братамі Адольфам і Міхаілам. Прыйшлі ў Радашковіцкі ваенкамат, адтуль на цягнік — і ў Бабруйск, у крэпасць. Навучалі там месяцы са тры (жылі ў бараках), найперш — як трэба страляць, да суровага жыцця рыхтавалі. На дварэ, напрыклад, марозік, а нас прыгналі да рэчкі і загадваюць хутка распрануцца і лезці ў ваду. Мы: «Як гэта? Голымі? Змерзнем...» А нам у адказ: «А калі на фронце спатрэбіцца? Як вы будзеце фарсіраваць рэчку?»

І потым такі спатрэбілася!

Прынялі прысягу і адразу на фронт. Прывезлі на цягніку ў Польшчу, у Беласток, размеркавалі, адправілі ў лес, кажуць — рабіце зямлянкі.

Абутак у нас благі быў, дзіравы, але на гэта ніхто не глядзеў. Цэлымі днямі ходзіш з мокрымі нагамі, ды яшчэ і нанач ідзеш у халодную зямлянку... Але ж нічога не зробіш, трывалі.

Зіму жылі ў лесе. Пасля адправілі на Кёнігсберг. Ішлі туды вельмі хутка. Памятаю, неяк сказалі, што сёння многа прайшлі — семдзесят кіламетраў...

Мне вельмі пашанцавала, што на вайне я быў разам з братам Адольфам. І не толькі ў адной дывізіі, але і пры адным кулямёце. Разам мы цягалі яго: брат — ніжнюю частку, я — ствол, які важыў каля трох дзясяткаў кілаграмаў.

Вера ў Бога яшчэ ратавала. Свой нацельны крыжык я ніколі не здымаў.

Але ж неяк мы фарсіравалі рэчку Нісу, сталі наступаць. Адольф быў наводчыкам кулямёта, я падносіў патроны. Помню, бягу і думаю: вось за тым узгорачкам упаду... Толькі сабраўся і бах — паваліўся, як скошаны. Мусіць, снайпер страляў. Як праз сон чую: «Ай-я-яй! Эдзіка забілі!» Гэта брат крычыць.

Пазней мне перавязалі нагу, і я разам з іншымі параненымі застаўся ляжаць на полі. Увечары нас сталі падбіраць, укладваць на калёсы. Прывезлі ў нейкую вёсачку, але палажылі чамусьці проста на зямлю, пакінулі нанач. Толькі назаўтра прыйшлі дактары і ўжо вырашалі, каго куды везці і як лячыць. Шпіталя не было. У нейкай хаце доктар рабіў перавязкі. Пасля ў цагельні лячылі. Рана стала крыху зацягвацца, зажываць, і мяне выпісалі ў запасны полк. Туды час ад часу прыязджала машына — высвятлялі, хто з якога палка, і забіралі. Так я зноў трапіў у сваю дывізію, што стаяла на мяжы з Чэхаславакіяй. Затым нас з Адольфам мабілізавалі.

...Пасля вайны працаваў у калгасе. Памятаю, пасля агляду ў шпіталі адна доктарка сказала: «З вашым здароўем, Эдуард Сямёнавіч, трэба лёгкую работу шукаць, не для вас цяжкая фізічная праца». А я толькі засмяяўся: «Міленькая, дзе ж вы на вёсцы лёгкую работу бачылі?»

Да працы, любой, я прывучаны з дзяцінства. Бацькі былі хлебаробы. Нас, дзяцей, мелі васьмёра: шэсць хлопцаў і дзве дачкі. Самы старшы — Юзаф, потым Міхаіл, Ядвіга, Ванда, Адольф, я. Пасля мяне — Валюсь, а затым яшчэ Волісь.

Бацька памёр, калі мне было 12, а малодшыя і зусім малыя... Нагаравалiся... А потым яшчэ і брат Юзя, які пасля бацькі за кармільца застаўся, разбіўся на таку.

Я пры панскай Польшчы скончыў у Пугачах чатырохкласную школу (навучанне праходзіла ў хаце, асобнага будынка не было). Потым мяне адправілі вучыцца ў мястэчка Гарадок, але пасля смерці брата на гаспадарцы працаваць не было каму, і ў шосты клас я ўжо не пайшоў.

Усё жыццё працаваў на зямлі: то ў калгасе на паляводстве, то вартаўніком пры конях, то пастухом... Мучыліся тады, бо пашы зусім не было, а затым у Еленку прыгналі яшчэ і кароў. Стаялі яны ў таках, у канюшні — кароўнік потым з'явіўся, і я загадчыкам фермы стаў. Хапіла ліха... Але ж змагаўся, стараўся як найлепш, 22 гады кіраваў.

Нашаму пакаленню цяжка жылося: трэба было і гарады будаваць, і гаспадарку выцягваць. Памятаю, у Налібоцкую пушчу пасылалі — прызначылі сто кубаметраў лесу вытраляваць. У нас добры конь быў. Снег, маразы, а мы набяром коням сена, сабе — хлеба... У лесе жылі, на марозе начавалі. Хто коней не меў, дрэвы рэзалі. Бярвенні па рэчцы сплаўлялі.

І тады, далібог, не глядзелі, хто там франтавік, хто не. Адразу пасля вайны бабы нават казалі: хто ваяваў — той прапаў, загінуў, а вы, можа, і пораху не нюхалі. Але я шкадаваў гэтых жанчын, бо ліха ім шмат дасталася, многія паўдавелі, цягнулі дзяцей, гаспадарку. Я ім падобраму казаў: «Дурніцы, каб усіх пабілі — дык тут немцы былі б... Ды і падумайце — касой косяць, і тое нейкая травіна застанецца. Таксама і на вайне»...

Але што казаць: пабілі ў нас многа — і мужыкоў, і хлопцаў...

Да рэвалюцыі ў Еленцы 60 хат было. Пры Польшчы парабілі хутары, і вёска амаль знікла: толькі сем двароў засталося, і адзін з іх — наш.

Пасля вайны талакой школу збудавалі.

Тут я і ажаніўся ў 47-м, не ў лепшы час. Марыю прысваталі, сказалі, што ёсць харошая дзяўчына, швачка. Я ўбачыў, што яна прыгожая, працавітая. Сталі мы з ёй разам хадзіць да касцёла ў Дубровы...

Спачатку жылі з ёй у доме маці, сталі памалу будавацца. У сваю хату засяліліся, калі там яшчэ і падлогі не было, — глінай выбілі. Так і жылі, усё паціху зрабілі, траіх дзяцей на ногі паставілі... Марыя працавала даяркай, вельмі добра шыла: сукенкі, спадніцы, гарнітуры рабіла ўсяму наваколлю. Дзеўкі, маладзіцы аж вішчалі ад яе фасонаў! Да таго ж яна і пявуння была. Хадзілі мы на вечарыны, танцавалі і польку, і кракавяк, а найболей любілі вальс...

Раней на Дуброўскі сельсавет было 47 ветэранаў, збіраліся кожны год на 9 Мая. А цяпер ужо нікога з маіх сяброў не засталося. Толькі я і адна партызанка ў суседняй вёсцы.

***

...З прыгожым юбілеем, стагоддзем, майго дзядулю прыязджала віншаваць кіраўніцтва Аляхновіцкага сельвыканкама, тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання, прафсаюзнай і ветэранскай арганізацый, настаўнікі і, вядома ж, нашчадкі!

Увечары ў гонар юбіляра быў салют у сто залпаў, які стаў сапраўднай падзеяй для невялічкай вёсачкі і яе жыхароў.

Ірына ЛАПЦЁНАК, унучка і (гэта дзякуючы дзеду з бабуляй) кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

г. Мінск.

Дзякуй!

НАШЫ, ГЛЫБОЦКІЯ!

...Не вам казаць: для таго каб паступіць у медінстытут, трэба дасканала вывучыць хімію з біялогіяй.

Дзесяцігоддзямі я выкладала ў школе гэтыя прадметы, помню вельмі многіх вучняў, але ж асобных, здаецца, найбольш. Антон Латаноўскі, напрыклад, прагна лавіў ці не кожнае слова, выконваў самыя складаныя заданні, шмат займаўся самастойна... І вось, помню, тэлефонны званок яго бацькі: Антон паступіў!

Нават я тады была на сёмым небе ад шчасця! Што ўжо казаць пра студэнта!

З часам ён паспяхова скончыў медыцынскі інстытут, інтэрнатуру і спраўдзіў-такі сваю мару: стаў хірургам, дзесяць гадоў працуе ўжо ў нашай Глыбоцкай раённай бальніцы і застаецца такі ж уважлівы да людзей, уедлівы да ведаў ды старанны да працы.

Аляксандр Яўгенавіч СМОЛЬСКІ, Аляксей Леанідавіч КАБУШ, Антон Аляксандравіч ЛАТАНОЎСКІ.

Многія ў райцэнтры ведаюць Антона Аляксандравіча, шчыра паважаюць і яго, і ягоных калег Аляксандра Яўгенавіча Смольскага і Аляксея Леанідавіча Кабуша — спецыялістаў з багатым прафесійным досведам.

І вось што цікава: неяк я трапіла ў абласную бальніцу, папрасілася на аперацыю да аднаго хірурга, але ён адмовіўся, бо гэта, маўляў, не ягоны профіль: ён робіць іншыя аперацыі.

Нашы ж хірургі не дзеляць іх на «свае» і «нечыя» — яны днём і ноччу ратуюць людзей, працуюць поплеч, за што яшчэ раз хочацца сказаць ім: «Дзякуй!»

Зоя Наваенка,
г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

Весткі з месцаў

КАБ ПОМНІЛІ...

Афганская вайна — своеасаблівая старонка нашай гісторыі, напісаная крывёй вайскоўцаў, слязьмі і горам іх родных. На карце Беларусі амаль не знойдзецца мясцін, ураджэнцы якіх не ўваходзілі б у склад так званага абмежаванага кантынгенту...

Ваявалі ў Афганістане і дзесяць хлопцаў з вёскі Дварэц ды ваколіц: Юрый Белятка, Віктар Буткевіч, Анатоль і Юрый Губко, Аляксандр і Генадзь Жылінскія, Валерый Івашка, Сяргей Сямашка, Уладзімір і Дзмітрый Лазовікі. Апошні з іх, ураджэнец вёскі Малая Палонка, за праяўленыя мужнасць і адвагу (на вялікі жаль, пасмяротна) узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Яго імя носіць піянерская дружына школы, сёлета ў рамках праекта «Без права на забыццё» збіраюцца матэрыялы для стварэння музейнага пакоя, для падрыхтоўкі кнігі пра воінаў-інтэрнацыяналістаў Дзятлаўшчыны. Валанцёры сочаць за парадкам на магілах Дзмітрыя Лазовіка і Юрыя Беляткі, штогод да дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у школе праводзіцца адкрыты турнір па валейболе...

На прыкладзе гераізму старэйшых выхоўваецца патрыятызм маладых.

Сяргей Каско,
кіраўнік школьнага гісторыка-краязнаўчага музея,
Дзятлаўскі раён.

Смех смехам

«Вайна» ў малодшай групе

...У той дзень унука з садка забірала я. Прыйшла, зазірнула ў пакой — малога нідзе не відаць. Не відаць і выхавацелькі, каб спытацца, дзе ён... Праўда, у цэнтры пакоя — дзіцячы натоўп. І заняты ён, мяркуючы па сагнутых, напружаных спінах, нечым вельмі сур'ёзным.

— Нясіце бінты! — даносіцца адтуль.

— Сястра, скальпель!

На ватных нагах кідаюся туды, праціскаюся паміж дзецьмі ў цэнтр натоўпу і бачу, што там, на падлозе (рукі раскінуты, вочы заплюшчаны) ляжыць наш хлопчык!

— Гэта яны ў вайну пяць хвілін гулялі, — ціха з-за спіны падказвае выхавацелька. — А цяпер во, лечаць параненых.

Ад гарэлкі розум мелкі?

Неяк раз еду я ў аўтобусе. Народу не сказаць, каб шмат, але месцы ўсе занятыя. А ў праходзе п'яны стаіць — ледзь на нагах трымаецца. Ва ўсякім разе, кандуктар проста не ведае, як яго абысці.

П'яны гэтую нерашучасць разумее па-свойму.

— Адкрыйце люк, — загадвае кандуктару, — а то вельмі горача.

— Гэта аварыйны. Бачыце, — жанчына паказвае пальцам уверх, — так і напісана: адкрываецца ў час аварый.

— Ага, значыць, такі адкрываецца?! — настойвае п'яны.

— Дык я ж кажу: у час аварый, пажараў...

— Тады адчыняйце: у мяне ўнутры ўсё гарыць!..

— Бач, ты — п'яны, — з павагай прамаўляе мужчына, што сядзіць побач са мной, — але розум не страціў.

Наталля Шастакова,
г. Гомель.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Год малой радзімы

АДЦЕННІ ЛЮБОВІ ДА РОДНАГА КРАЮ

У сучаснай беларускай літаратуры добра вядома імя Алеся БАДАКА. Празаік, паэт, дзіцячы пісьменнік, публіцыст, перакладчык... А яшчэ — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Яркая творчая асоба. Лаўрэат Рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты купідон», лаўрэат прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Зоркі Садружнасці». Сённяшняя наша гутарка з ім — не толькі пра літаратуру.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Там купіла сабе з мужам хату Раіса Баравікова, куды прыязджае на лета.

— Алесь Мікалаевіч, хоць і нарадзіліся вы на Берасцейшчыне, у Ляхавіцкім раёне, ведаю, што вы парадніліся з Міншчынай. Ёсць у вас лецішча на Уздзеншчыне... Ці часта там бываеце? Раскажыце, калі ласка, як «прыраслі» да гэтага куточка.

Слова «дача» ці «лецішча» ў мяне асацыіруецца з нечым штучна ўзніклым, што не мае глыбокай гісторыі: выдзелілі зямлю, на якой пабудавалі домікі, раскінулі маленькія агародзікі. Летам там жыццё ёсць, а зімою ні душы не ўбачыш. З Міншчынай я зрадніўся дзякуючы жонцы: там засталася хата, у якой некалі жыла яе вялікая радня: маці, дзед з бабуляю, цёткі. Хата старэнькая, яшчэ даваенная, але затое многія рэчы ў ёй маюць багатую гісторыю, нясуць у сабе адбітак даўніх часоў. Тым яна і прыцягвае. Я ўпершыню там пабываў у сярэдзіне 1990-х і з таго часу бываю штогод, з мая да кастрычніка, па некалькі разоў на месяц, і абавязкова праводжу там частку адпачынку. Я не люблю, калі агарод зарастае пустазеллем, люблю свае памідоры, агуркі, свае вішні, сліўкі, яблыкі, таму працы хапае. А яшчэ там зусім побач лес, рака Неманец. Адным словам, ёсць дзе адпачыць.

— Ці ведаеце літаратурную гісторыю Уздзеншчыны? З гэтых мясцін Паўлюк Трус, Кандрат Крапіва, Алесь Якімовіч, Пятро Глебка, Лідзія Арабей...

— Безумоўна. У гэтым плане Уздзеншчына, вядома, унікальная зямля — столькі талентаў дала свету. Адтуль жа, дарэчы, і Алесь Пальчэўскі, і Васіль Шырко, і шмат хто яшчэ з пісьменнікаў... лі я стаў жыць у Мінску, мне доўга не пісалася так добра, як дома, у сваёй роднай вёсцы Туркі, што ў Ляхавіцкім раёне, на Берасцейшчыне. А цяпер мне нідзе так добра не пішацца, як у сваёй мінскай кватэры. Але справа не ў нейкіх асаблівых умовах. Вось прыязджаю я, напрыклад, дадому. Мне хочацца як мага больш пагаварыць з мамай, з братам, нешта дапамагчы зрабіць, нарэшце проста прайсціся па вёсцы, паглядзець, што ў ёй змянілася, пабачыць вяскоўцаў. Душа настроена не на творчасць, а на зусім іншае. Тое ж самае датычыцца і Камянога: выпадае вольная хвіліна — хочацца ў лес альбо на рэчку. Іншая справа, што так званы «падрыхтоўчы працэс» — абдумванне нейкіх сюжэтаў, вобразаў, — ён бывае паўсюль. І на Уздзеншчыне, у Камяным, у ваколіцах гэтай мілай вёскі — таксама.

— Бераце на Уздзеншчыну кнігі? Як чытаецца ў гэтых мясцінах?

— У мяне ў Камяным вельмі вялікая бібліятэка. Па-першае, я кнігаман, і ўсе кніжныя паліцы ў мінскай кватэры даўно застаўлены, а па-другое, быў час — пачатак 1990-х, — калі ўсе кінуліся купляць дэтэктывы, фантастыку і за капейкі здавалі ў букіністычныя крамы класіку. Я тады вельмі шмат кніг купіў, асабліва не думаючы пра тое, ці будуць патрэбны яны мне для штодзённага карыстання. А добра папрацаваўшы на агародзе, вельмі хораша бывае разгарнуць пасля томік якога-небудзь Галсуорсі і пачытаць некалькі старонак пад прыемны птушыны спеў за расчыненым акном.

— Ці параўноўваеце свой уздзенскі «прытулак» з роднымі ляхавіцкімі вёсачкамі?

— Што б цябе ні звязвала з іншымі мясцінамі, якія б цудоўныя краявіды там ні былі, даражэй за Бацькаўшчыну ўсё роўна няма нічога. Гэта па-за ўсякімі параўнаннямі. Нармальны ж чалавек, які вырас у добрай сям'і, ніколі не стане параўноўваць сваю маці з іншай жанчынай. Мне здаецца, яму нават і ў галаву такое не прыйдзе. Але чалавечая любоў мае вельмі шмат адценняў, і як кожнага чалавека, так і кожную мясціну мы любім па-свойму.

Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.

Спытайце пра радзіннае

Чаго не рабілі на збыта?

Г. П. Няпэўная з Чэрвеньскага раёна пацікавілася: «Ці праўда, што на стары Месяц не варта пачынаць нічога новага?»

Трэцюю квадру Месяца, якую ў народзе называлі старык, збыта, на сходні, ветах, веташка, лічылі самай неспрыяльнай для правядзення сельскагаспадарчых і дамашніх работ, а таксама для перспектыў будучага жыцця. У некаторых мясцінах пачатак (першыя дні) апошняй квадры Месяца называюць яшчэ рушанне (г. зн. зрушыцца з месца, разваліцца).

Як казалі на Гарадзеншчыне: «Трэцяя квадра і маладзік лічацца часам, неспрыяльным для вывазу гною і іншых палявых прац... не толькі беларус, але і жмудзін не пачне ні араць, ні вазіць гной, ні сеяць». У «Матэрыялах для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраных афіцэрамі генеральнага штаба ў Смаленскай губерні, 1862 г.» знаходзім: «Белоруссы строго наблюдают новолуние, полнолуние и ущерб месяца; во время ущерба они не начинают посева хлеба». А народная мудрасць безапеляцыйна абвяшчае: «Пасеяўшы на сходу, не дажыдай плоду».

Нашы далёкія продкі ведалі аб існаванні вялікага касмічнага закона, які цалкам падпарадкоўваўся цыклічнасці фаз Месяца. З надыходам маладзіка ў прыродзе ўсё быццам ажывала і набывала дынаміку імклівага напаўнення сокамі зямлі. І наадварот, калі Месяц паварочваў на збыта, быццам нечая вялікая рука стамлялася і на нейкі час апускалася ўніз для кароткага адпачынку. Следам за ёй уніз, да каранёў, кіраваліся і энергетычныя патокі. У гэты час раілі саджаць тыя культуры, якія фарміравалі свае плады ніжэй за гарызонт зямлі: бульбу, буракі, цыбулю, часнок.

Сімволіка збыта — знішчэння, памяншэння — абумоўлівала характар працы: у гэты час займаліся праполкай, пасынкаваннем, выкарчоўвалі кустарнікі, падстрыгалі дрэвы. Лічылася, што на збыта барацьба са шкоднікамі садоў і агародаў будзе асабліва паспяховай. Для пярыны стараліся браць пяро, якое было нарыхтавана адразу ж пасля поўні, тады яно лажылася гладка. Калі ж пяро апрацоўвалася ў іншы час, то пярына «будзе быццам заўсёды вільготная».

Неабходна адзначыць, што вызначанае стаўленне да фаз Месяца і свядомае разуменне сэнсу прыродна-касмічных працэсаў і рытмаў адпаведна праецыравалася і на час нараджэння чалавека, і на час яго смерці. Лічылася, што доўга жыць будуць тыя дзеці, якія нарадзіліся ў першую чвэрць, шчаслівыя і багатыя з'яўляюцца на свет у другую чвэрць. У сувязі з гэтым народная традыцыя выпрацавала правілы, з дапамогай якіх можна было пэўным чынам уздзейнічаць на лёс дзіцяці (падкарэктаваць адмоўныя фактары), якое нарадзілася на збыта ці на межы — калі месяца зусім няма на небе: напрыклад, пахрысціць яго на маладзік.

Ад В. А. Астаповіча ў вёсцы Данілевічы Лельчыцкага раёна мы таксама пачулі наступнае меркаванне: «Гаварылі, калі чалавек памёр на збыта, то праз некаторы час і гаспадарка яго ўся сыдзе».

Можа, таму на збыта, асабліва ў самыя апошнія дні трэцяй чвэрці Месяца, пазбягалі ладзіць вяселлі, улазіны, пачынаць перспектыўныя, доўгачасовыя справы, адпраўляцца ў вандраванне, кіруючыся мудрымі словамі: «Калі пойдзе месяц на збыт, дык павыплывае ўсякае няшчасце на світ».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

УГНАЕННІ ДЛЯ РАСАДЫ

Лічыцца, што найлепшыя ўгнаенні для расады павінны ўтрымліваць у сабе комплекс карысных рэчываў, важных для паўнавартаснага развіцця расліны: азот, фосфар, калій (напрыклад, у нітраамафосцы змяшчаецца роўная колькасць гэтых элементаў). Тым не менш падкормка расады аднакампанентнымі ўгнаеннямі прыйдзе на дапамогу ў тым выпадку, калі расліны адчуваюць недахоп у нейкім канкрэтным рэчыве.

Вадкія падкормкі лічацца самымі эфектыўнымі. Паліў расады ўгнаеннем дазваляе карысным рэчывам хутчэй паступіць да каранёў расліны, а значыць, і эфект ад такой падкормкі большы, чым пры выкарыстанні грануляванага прэпарату.

Асноўныя прыкметы **азотнага галадання:** пажаўценне ніжніх лісточкаў, спыненне росту.

Калі вы заўважылі, што лісце і сцёблы раслін пачалі цямнець і набываць фіялетава-барвовую афарбоўку, то, хутчэй за ўсё, яны адчуваюць **недахоп фосфару.** Першую фосфарную падкормку ўносяць толькі тады, калі расліна цалкам укаранілася, у ідэале — пасля пікіроўкі.

Тыповыя сімптомы **недахопу калію** — хларатычныя плямы і жоўтая акантоўка лісця. Першую калійную падкормку расады праводзяць пад корань, калі ў раслiны ўжо з'явілася 2-3 сапраўдныя лісточкі. Наступнае ўнясенне ўгнаення праводзіцца праз 10—14 дзён пасля пікіроўкі ці высадкі расады ў грунт.

Чым падкарміць расаду таматаў?

Як ужо было сказана, выбар асноўнага элемента падкормкі залежыць ад таго, якога канкрэтна рэчыва не хапае расліне. Для гарманічнага развіцця расаду таматаў падкормліваюць па наступнай схеме.

1-я падкормка: са з'яўленнем трэцяга сапраўднага лістка — вадкае комплекснае ўгнаенне з перавагай азоту (1-2 ст. л. сухога прэпарату на 10 л вады).

2-я падкормка: на 11—12-ы дзень пасля пікіроўкі — нітраамафоска (0,5 ст. л. на 5 л вады, па 100 мл на 1 расліну).

3-я падкормка: праз два тыдні паўтараецца ўнясенне нітраамафоскі ў тых жа прапорцыях.

4-я падкормка: калі расадзе споўніцца 2 месяцы, праводзіцца калійна-фосфарная падкормка (1/2 ст. л. простага суперфасфату і 1 ст. л. попелу на 5 л вады, расход — 0,5 шклянкі на 1 расліну).

Чым падкарміць расаду перцу?

1-я падкормка: у фазе першага сапраўднага ліста — раствор мачавіны (1 ст. л. на 10 л вады).

2-я падкормка: праз тры тыдні паўторна мачавіна ці іншае азотнае ўгнаенне ў тых жа прапорцыях.

3-я падкормка: за 7—10 дзён да перасадкі ў грунт падкарміць падвойным суперфасфатам або іншым азотасмяшчальным прэпаратам (можна паўтарыць унясенне мачавіны).

Угнаенне для расады кветак

У першы раз расаду кветак угнойваюць праз тыдзень пасля пікіроўкі. Затым падкормкі паўтараюць штотыдзень. Ужываюць растворы комплексных мінеральных угнаенняў, чаргуючы іх з арганікай, напрыклад, разведзеным вадой (1:10) настоем каравяку.

Дамашнія ўгнаенні для расады

Угнаенне для расады, прыгатаванае ў дамашніх умовах, — даступны кожнаму спосаб падкарміць расліны, калі пад рукой няма крамных прэпаратаў.

Бананавае

У трохлітровы слоік пакласці лупіну ад 3-4 бананаў і заліць да верху кіпячонай вадой. Паставіць у цёмнае месца на 4-5 сутак і працадзіць. Раствор захоўваюць у слоіку да 1 месяца. Такая падкормка змяшчае нямала калію і карысная таматам, перцу, агуркам, капусце, баклажанам. Перад ужываннем разбавіць раствор вадой 1:1.

Цыбульнае

Заліць 1 шклянку цыбульнага шалупіння 10 л вады і давесці да кіпення. Адвар астудзіць і працадзіць. Цыбуля не толькі багатая пажыўнымі элементамі, але і дапаможа ў барацьбе з хваробамі і шкоднікамі.

Памылкі пры падкормцы расады

Падкормка ў вячэрнія гадзіны. Лепш за ўсё расліна рэагуе на падкормку, праведзеную раніцай, калі расада «адпачывае» пасля актыўнага начнога росту.

Няправільная тэхніка. Пры ўнясенні ўгнаенняў нельга дапускаць, каб яны траплялі на лісце або сцёблы расліны, — гэта можа стаць прычынай з'яўлення апёкаў.

Ранняе ўнясенне калійных угнаенняў. Угнаенні, што змяшчаюць вялікую колькасць гэтага рэчыва, могуць загубіць расліну, якая знаходзіцца ў фазе з'яўлення першых усходаў і актыўнага фарміравання каранёвай сістэмы.

Выкарыстанне «няправільнай» вады. Лепш за ўсё падыходзіць вада, якая па сваім саставе максімальна набліжана да натуральных умоў, г. зн. дажджавая або талая, але толькі калі яна была ўзята ў экалагічна чыстым раёне. У якасці альтэрнатывы можна выкарыстоўваць і ваду з-пад крана, якая адстаялася некалькі дзён. Звярніце ўвагу, што ў працэсе кіпячэння вадкасць траціць кісларод і гэта адмоўна адбіваецца на расадзе.

Аптымальная тэмпература вады для паліву расады — 20—25 °С.

Новыя кнігі

МАШТАБ АСОБЫ

Выдадзены «Летапіс жыцця і творчасці Івана Пятровіча Шамякіна»

Такія кнігі з'яўляюцца нячаста. І чытач у іх не самы масавы. Але гэта ні ў якім разе не адпрэчвае выключнае гісторыка-літаратурнае, асветніцкае значэнне падобных выданняў. «Летапіс жыцця і творчасці Івана Пятровіча Шамякіна» (Мінск, «Беларуская навука», 2020 год) — вялікая падзея не толькі ў беларускім літаратуразнаўстве. Гэтая ёмістая кніга, якую сабраў, напісаў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук доктар філалагічных навук Міхась Іосіфавіч Мушынскі, з'яўляецца своеасаблівым дакументам часу. Дзень за днём, выкарыстоўваючы мноства розных крыніц, даследчык узнаўляе жыццё чалавека, які пакінуў пасля сябе вялікую творчую спадчыну, здолеў спалучыць у сабе шмат якасцяў і творчай асобы, і сапраўды актыўнага грамадскага і палітычнага дзеяча. Мастацкая літаратура, відавочна, была для яго праявай злучанасці чалавека, нераўнадушнага грамадзяніна, сацыяльна неабыякавага да навакольнага жыцця, з лёсам Беларусі, сваёй Айчыны, ды той савецкай краіны, якая выпеставала яго высокі талент. Дзясяткі раманаў, аповесцяў Івана Шамякіна, а следам і спектакляў, кінафільмаў, зробленых, пастаўленых па яго творах, — і сёння на слыху ў чытача, гледача. Яшчэ жыве пакаленне ўдзячных чытачоў, тых людзей, якіх вынайдзеныя пісьменнікам сюжэты, вобразы, сімвалы хвалявалі, прымушалі думаць, разважаць над жыццём. Гэтым і цікавы летапіс яго пісьменніцкага і чалавечага лёсу, гэтым і цікавая праца Міхася Мушынскага, што старонкі кнігі паказваюць веліч, маштаб Асобы.

У многіх сваіх днях Іван Шамякін судакранаўся са «Звяздою» — партыйнай, урадавай і парламенцкай газетай, якая не толькі пісала пра яго ў рэцэнзіях і артыкулах, але і яго завостранаму публіцыстычнаму слову давала месца.

Дарэчы, якраз зусім «звяздоўскім» здаецца і адзін з раманаў І. Шамякіна. Цытуем па «Летапісе...» згадку пра лета 1976 года: «Падчас прагулкі па парку сустракае рэдактара газеты «Звязда» А. Тоўсціка, які распавёў пісьменніку драматычную гісторыю паліцая, асуджанага на дваццаць пяць гадоў сібірскіх лагераў за злачынствы, учыненыя ў гады фашысцкай акупацыі. Адбыўшы суровае пакаранне, вясковец атрымаў правы грамадзянства, уладкаваўся на працу лесарубам. Але неўзабаве яго знайшлі ў лесе павешаным. Афіцыйная версія гэты выпадак палічыла самагубствам, вяскоўцы — пакараннем былых партызанаў і дзяцей тых, хто загінуў па даносе паліцая. Так нарадзіўся сюжэт рамана.

З мэтаю заглыблення ў жыццёвы матэрыял пісьменнік едзе ў творчую камандзіроўку ў калгас імя Урыцкага Гомельскага раёна...» Размова — пра раман «Вазьму твой боль», які Іван Шамякін закончыў пісаць 24 мая 1978 года.

У адным з некралогаў, які прыведзены напрыканцы «Летапіса», ёсць такія словы: «Па сваёй прыродзе Іван Пятровіч Шамякін быў знакавай нацыянальнай асобай, надзвычай плённым і таленавітым творцам...» І яшчэ — з таго самага некралога: «Ягоныя героі, як атланты і карыятыды з аднайменнага рамана, гожа, надзейна, вечна трымаюць храм нашай духоўнасці на сваіх волатных плячах».

Крыху меней чым праз год будзе вялікая дата — стагоддзе з нараджэння пісьменніка. «Летапіс жыцця і творчасці...» — добры напамін, каб не забыліся пра будучы юбілей. Не забыліся дзяржава, многія інстытуты ўлады, грамадскія арганізацыі, беларускі народ. Нагадаем, што ў 2010—2014 гадах у «Мастацкай літаратуры» пабачыў свет збор твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах. Івана Шамякіна, аўтара «Трывожнага шчасця», раманаў «Сэрца на далоні», «Крыніцы», «Снежныя зімы», іншых твораў, якія і праз многія дзесяцігоддзі застануцца мастацкімі дакументамі часу, чытачы не забудуць.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

11 САКАВІКА

У краіне

1845 год — нарадзіўся (вёска Цяруха цяперашняга Гомельскага раёна) Васіль Пятровіч Ермакоў, расійскі матэматык, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1884). У 1868-м скончыў Кіеўскі ўніверсітэт, дзе і працаваў. У 1884—1886 гадах выдаваў «Часопіс элементарнай матэматыкі». Аўтар навуковых прац па матэматычным аналізе, алгебры, тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, механіцы, падручнікаў і навуковых дапаможнікаў для ВНУ.

1903 год — нарадзіўся Тодар Тодаравіч Кляшторны, беларускі паэт, перакладчык. Аўтар паэтычных зборнікаў «Кляновыя завеі», «Светацені», «Ветразі», паэм «Беларусь», «Сляды дарог» і іншых твораў. Пісаў для дзяцей. Асобныя вершы Кляшторнага пакладзены на музыку. У 1936 годзе арыштаваны. Расстраляны ў 1937-м. Рэабілітаваны ў 1957-м.

1911 год — нарадзіўся Леў Юр'евіч Гарошка, беларускі рэлігійны і грамадскі дзеяч, даследчык гісторыі рэлігіі і царквы ў Беларусі, беларускай культуры. З 1944-га ў эміграцыі. Быў рэктарам Беларускай каталіцкай місіі ў Францыі і Вялікабрытаніі, кіраўніком беларускай школы імя святога Кірылы Тураўскага ў Лондане і беларускай секцыі радыё Ватыкана, рэдактарам і выдаўцом часопіса «Божым шляхам». Рэлігійную, культурна-асветніцкую дзейнасць сумяшчаў з вывучэннем, папулярызацыяй багаслоўскай думкі, гісторыі хрысціянскай царквы і рэлігійных адносін у Беларусі, беларускай культуры. Аўтар шэрагу публікацый па гэтай тэматыцы, у тым ліку біяграфічных нарысаў пра беларускіх святых Ефрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага і іншых.

У свеце

1775 год — нарадзіўся Васіль Рыгоравіч Анастасевіч, рускі літаратар, паэт, журналіст, адзін з першых рускіх перакладчыкаў, правадзейны член Румянцаўскага гуртка. Выдаваў часопіс «Вулей».

1910 год — нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч Какінакі, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР, Герой Савецкага Саюза (1964), палкоўнік. Падчас Вялікай Айчыннай вайны камандаваў 401-м авіяцыйным палком. У 1942—1950 гадах праводзіў выпрабаванні серыйных самалётаў МіГ. З 1951-га працаваў у вопытным канструктарскім бюро Арцёма Мікаяна. У 1960-м на самалёце Е-66 устанавіў абсалютны сусветны рэкорд хуткасці палёту па замкнёным маршруце працягласцю 100 кіламетраў — 2148,66 кіламетра ў гадзіну.

1985 год — на пазачарговым пленуме Генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны Міхаіл Гарбачоў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.34	19.07	11.33
Віцебск	7.24	18.55	11.31
Магілёў	7.24	18.57	11.33
Гомель	7.19	18.54	11.35
Гродна	7.48	19.22	11.34
Брэст	7.48	19.24	11.36

Месяц

Поўня 9 сакавіка.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Ганны, Івана, Парфірыя, Пятра, Севасцьяна, Сяргея.*
К. *Бенядзікта, Канстанціна.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Па панядзелках будзільнік звініць у два разы гучней, чым звычайна. Прычым з непрыхаванай злараднасцю.

Адзін хлопчык так завіс у віртуальнай рэальнасці, што яго прыйшлі ратаваць з рэальнага ваенкамата.

— Мне здаецца, Джон, што муж здраджвае столькі разоў, колькі пра гэта ведае жонка.

— Не болей, сэр.

— Што за дзень сёння такі, ужо злосці не хапае!

— Магу пазычыць. Вернеш з невялікімі працэнтамі.

— Каханая, а чаму ты ўвесь час вочы закочваеш?

— Мазгамі любуюся!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 943.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 сакавіка 2020 года.